ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 МАЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 93 (28203) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАГОР'ЕЎСКІЯ «ЗАСЕЎКІ»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У паўночных раёнах краіны яшчэ працягваецца пасадка бульбы. Гэты здымак зроблены днямі ў вёсцы Загор'е Ушацкага раёна Віцебшчыны.

Праца... пад купалам цырка

Першакурснікаў — пад апеку!

Конкурс «ЧЗ»

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар ЯКЖЫК, намеснік міністра адукацыі:

«Сучаснае развіццё інтэрнэт-тэхналогій патрабуе ўважлівага і вельмі сур'ёзнага стаўлення з боку дарослых да інфармацыйных патокаў, у якія ўключаны нашы дзеці. Безумоўна, стварэнне належных умоў для развіцця маральна здаровай і ўстойлівай да вонкавых уздзеянняў асобы дзіцяці з'яўляецца адной з галоўных задач нашай дзяржавы».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 19°
Віцебск	+ 17°
Гомель	+ 17°
Гродна	+ 17°
Магілёў	+ 17°
Мінск	+ 18°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.05.2016 г.

Долар ЗША	19375,00	▲
Еўра	21823,00	▲
Рас. руб.	297,71	▼
Укр. грыўня	767,33	▲

9 771990 763008 16093

■ Нацыянальны здабытак

«НАЙЛЕПШ БЫЛО Б АТРЫМАЦЬ АРЫГІНАЛЫ»

Алесь Суша пра спадчыну Скарыны, 300 мерапрыемстваў у юбілейны год і «расцярушаныя» кнігазборы

Старыя друкаваныя выданні — гэта непасрэдныя сведкі мінуўшчыны. Глядзіш на іх і быццам чуеш шум працы друкарскага станка. У паветры пачынае пахнуць свежай фарбай. А вось зайшоў сам доктар Скарына і пачаў здымаць ужо высушаныя аркушы і сшываць іх разам... Не толькі час першадрукара, але і розныя іншыя эпохі паўстаюць перад намі дзякуючы старым кнігам. Пра кнігазборы магнацкіх родаў, асветнікаў, старажытных манастыроў мы пагутарылі з намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшынёй Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Алесем СУШАМ.

СТАР. 15

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Сітуацыя

ПРАВА НА (С)ПАКОЙ

Апякунка сіраты лічыць, што ўрач пасягнуў на жылплошчу дзіцяці

«Ні грошай, ні прыбаўкі да пенсіі нам не трэба. Просім аднаго — дазволіць здаваць пакой». Мінчанка Алена Сікорская ўжо другі год спрабуе, як яна кажа, дабіцца справядлівасці. Стараецца не для сябе — для ўнука сястры. Хлопчык застаўся без бацькоў, жыве ў бабулі, якая афармліла над ім апеку. На паперах сірата нядрэнна забяспечаны: у яго ўласнасці ёсць доля ў двухпакаёвай кватэры. Але па факце ні жыць у тым пакоі, ні здаваць яго ў арэнду немагчыма. Першаму перашкаджае інваліднасць хлопца, другому — саўладальнік кватэры, які не дае сваёй згоды. І, што самае крыўднае для жанчын, па законе сусед мае на гэта права.

АБЯЦАННІ РЫЭЛТАРАЎ

За сталом у светлым пакойчыку Галіна Трафімаўна робіць з унукам урокі. Той ціхенька слухае бабуліны тлумачэнні і старанна перапісвае заданні ў сшытак. Алена Трафімаўна тым часам раскладае перад намі ўсе паперы, што назбіраліся за гады разбору, і ўводзіць у курс справы. Менавіта яна бегае па судах і іншых інстанцыях. «Я ўзяла ўсё гэта на сябе, каб сястра нервы не матала. Хаця б да 18 гадоў Уладзіка давяла...»

Хлопчык, пра якога клапоцяцца жанчыны, — інвалід з дзяцінства. Пры нараджэнні перанёс інсульт. Як вынік — ДЦП. Маці Улада Кашкана, дачка Галіны Трафімаўны, памерла праз гепатыт, калі малому было чатыры гады. Лячыцца жанчына не хацела, жыць таксама. Пагражала, што захінецца разам з сынам у футра і выкінецца ў акно.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Маладым і таленавітым

Распараджэннем кіраўніка дзяржавы прынята рашэнне аб фінансаванні расходаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у 2016 годзе ў памеры Br7,9 млрд з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Распараджэннем таксама зацверджана рашэнне савета фонду аб заахвочванні 100 навучэнцаў і студэнтаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Грашовымі прэміямі ў памеры ад Br8,4 млн да Br11,55 млн з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 20 пераможцаў міжнародных алімпіяд і канферэнцый.

Заахвочвальная стыпендыя ў памеры Br840 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду назначана 2 пераможцам 12-й міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіяды па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы.

Грашовыя прэміі таксама прысуджаны 44 пераможцам алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць» 2015 года і 34 пераможцам XVII Рэспубліканскага конкурсу (турніру) юных матэматыкаў.

■ Парламенцкі дзённік

Найлепшая альтэрнатыва — дыялог

Прадстаўнікі міжнародных арганізацый, дзяржаўных і недзяржаўных структур абмеркавалі выбарчую палітыку

Як павінна праходзіць выбарчая кампанія, каб яе можна было назваць празрыстай, а вынікі выбараў ні ў кога не выклікалі сумненняў? Якіх змен чакаюць ад нашай краіны ў плане выбарчага працэсу міжнародныя арганізацыі? Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі «круглага стала» «Стандарты правядзення выбараў і ўдасканаленне выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь», арганізаванага Нацыянальным сходам нашай краіны і Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Адзін бок стала — для назіральнікаў

Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, у размове з журналістамі пасля першай сесіі «круглага стала» нагадала, што Цэнтрвыбаркам напярэдадні парламенцкіх выбараў зрабіў упор на ўдасканаленне правапрымяняльнай практыкі.

— У сувязі з чым Цэнтральная камісія ўжо прыняла шэраг пастаноў, якія тычацца самага важнага моманту — узмацнення празрыстасці падвядзення вынікаў выбараў, — сказала старшыня Цэнтральнай камісіі. — У прыватнасці, вызначана працэдура падліку галасоў, якая дазволіць назіральнікам бачыць усе дзеянні, якія здзясняе ўчастковая выбарчая камісія. Дазволены доступ міжнародных назіральнікаў у памяшканні акружных камісій пры звядзенні вынікаў выбараў. Назіральнікам дадзена права на атрыманне інфармацыі аб колькасці выбаршчыкаў, якія ўключаны ў спісы для галасавання і якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Акрамя гэтага, узмоцнена празрыстасць разгляду выбарчых спрэчак.

— Больш празрысты дыскусійны парадак прадугледжваецца для ўстанаўлення працэдуры ўтварэння ўчастковых, акружных і тэрытарыяльных выбарчых камісій, — паведаміла Лідзія Ярмошына.

Яна адзначыла, што Цэнтральная камісія ў сваю чаргу будзе строга назіраць за выкананнем вышэйпералічаных новаўвядзенняў. Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, члены выбарчых камісій павінны паводзіць сябе ў адпаведнасці з метадычнымі рэкамендацыямі Цэнтральнай камісіі.

— Калі на месцах добра правядуць вучобу (згодна з нашым прыкладным сцэнарыем трэнінгу), то ва ўчастковых выбарчых камісій не будзе памылак. Калі памылкі будуць, то назіральнікі абавязкова прасігналізуюць пра гэта і члены ўчастковай выбарчай камісіі панясуць адказнасць — аж да крымінальнай.

Адказваючы на пытанне наконт працэдуры падліку галасоў, Лідзія Ярмошына сказала, што яны павінны падлічвацца, як звычайна. Толькі адзін бок стала, на якім падлічваюцца галасы, павінен быць цалкам адкрыты для назіральнікаў. Яны павінны бачыць усю працэдуру падліку.

Рэкамендацыі даюцца ўсім краінам

Андрэа РЫГОНІ, дакладчык па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях і дэмакратыі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ), падчас свайго выступлення асобна падкрэсліў, што ўсе краіны-члены Савета Еўропы (а іх 47) рэгулярна атрымліваюць ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ) рэкамендацыі па паляпшэнні выбарчага працэсу. Значыць, падкрэсліў прадстаўнік ПАСЕ, работа над удасканаленнем заканадаўства характэрна не толькі для нашай краіны. Андрэа Рыгоні сказаў, што ў яго самога было 55 місій па назіранні за выбарамі ў розных краінах.

— Мы прыкладалі і будзем прыкладаць намаганні, каб палепшыць базавыя стандарты для выбараў, — заявіў ён. — З гэтага пункту гледжання паляпшэнне выбарчага заканадаўства ёсць паляпшэнне стану дэмакратыі ў канкрэтнай краіне.

На думку Андрэа Рыгоні, будучыя парламенцкія выбары ў нашай краіне стануць фундаментальным этапам у працэсе нармалізацыі стасункаў Беларусі з Саветам Еўропы і Еўрасаюзам. Ён выказаў упэўненасць, што наша краіна павінна ўвайсці ў ПАСЕ. Таксама ён выступіў за паступовае збліжэнне нашай дзяржавы з Саветам Еўропы. На яго думку, дыялог і супрацоўніцтва не маюць альтэрнатывы.

Андрэа Рыгоні лічыць, што для таго, каб парламент паспяхова працаваў, ён павінен уяўляць сабой «саюз людзей, што мысляць справядліва» — г.зн. у яго складзе павінны быць людзі, якія прытрымліваюцца розных поглядаў.

Не загады, а парады

Генадзь ГРЫЦКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, лічыць, што за гады незалежнасці выбарчае заканадаўства нашай дзяржавы прайшло паслядоўны, эвалюцыйны шлях фарміравання і развіцця.

— У выніку створана сучасная выбарчая сістэма, якая адказвае высокім дэмакратычным патрабаванням, — звярнуў увагу ён. — З улікам уласнага нацыянальнага вопыту правядзення дэмакратычных выбараў і рэферэндумаў у краіне здзяйсняецца планамерная сістэмная праца па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства. Трэба адзначыць, што ў Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь не раз уносіліся змены, накіраваныя на дэмакратызацыю выбарчага працэсу — таксама і з улікам рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ.

Яго калега **Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах**, станоўча ацаніў гутарку, што адбылася ў рамках «круглага стала».

— Прыемна, што ў гэтай зале я нарэшце пачуў нармальнае тлумачэнне слова «рэкамендацыя», — прызнаўся Віталь Бусько, — гэта парада. А ў мінулыя гады для нас гэта гучала як аксіёма, як догма, якая не можа абмяркоўвацца. Сёння мы нарэшце прыйшлі да разумення, што рэкамендацыя павінна выконвацца, калі яна не супярэчыць нашаму заканадаўству, нашым нацыянальным інтарэсам, нашым традыцыям.

У дыскусійнай частцы «круглага стала» дэпутат падняў пытанне, наколькі правільна выкарыстоўваць тэрмін «аб'ектыўна незалежны назіральнік»? На думку нашага парламентарыя, любы назіральнік прадстаўляе нейкую арганізацыю, партыю, грамадскі рух — ён ужо з гэтай прычыны не з'яўляецца незалежным. Дэпутат прапанаваў выкарыстоўваць фразу «назіральнік з аб'ектыўным меркаваннем».

Андрэа Рыгоні ў адказ таксама прызнаўся, што размова яму вельмі спадабалася. Ён пагадзіўся з Віталем Бусько — сапраўды, на думку прадстаўніка ПАСЕ, ніхто не можа быць цалкам незалежным: у чалавека заўсёды ёсць нейкія ўласныя перакананні, погляды. У сувязі з гэтым, лічыць ён, станоўчую ролю адыгрывае плюралізм.

* * *

У «круглым стале» таксама прынялі ўдзел прадстаўнікі Венецыянскай камісіі, БДІПЧ АБСЕ, Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў, Еўрапейскага парламента, Цэнтра еўрапейскай перспектывы. Былі прадстаўнікі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Выканаўчага камітэта СНД, Міністэрства замежных спраў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

ДЭЛЕГАТЫ НАРОДНАГА ВЕЧА

Удзельнікам сходу выбраны прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў

Кіраўнік урада выбраны ад Маскоўскага раёна сталіцы. Разам з ім ад гэтага раёна Мінска быў выбраны 61 дэлегат. У тым ліку міністр фінансаў Уладзімір Амарын, міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Абламейка, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Мікалай Казаравец.

Фота БЕЛТА.

«Гэта сапраўды вельмі важная падзея для мяне асабіста як грамадзяніна Беларусі і як службовай асобы, — прызнаўся Андрэй Кабякоў у размове з журналістамі, — таму што Усебеларускі народны сход — своеасаблівае народнае вечаа, тое месца, дзе будзе вызначацца лёс краіны на найбліжэйшую, сярэднетэрміновую і больш далёкую перспектыву».

Кіраўнік беларускага ўрада расказаў, што будзе ўдзельнічаць ва Усебеларускім народным сходзе пяты раз. «Мне пашчасціла быць дэлегатам на чатырох папярэдніх, цяпер я выбраны дэлегатам і на пяты сход, — сказаў ён. — Ёсць пэўны элемент хвалявання, таму што цяпер я ў новым статусе і буду трымаць перад грамадзянамі адказ за тое, што было зроблена ўрадам за адпаведны перыяд часу, і за тыя планы, якія давядзецца рэалізоўваць у краіне».

Андрэй Кабякоў падкрэсліў выключную важнасць правядзення такога мерапрыемства, як Усебеларускі народны сход, у якім могуць удзельнічаць усе найбольш актыўныя грамадзяне краіны. «На мерапрыемстве прадстаўлены ўсе слаі, зацікаўленыя групы, — звярнуў увагу прэм'ер-міністр. — Вельмі важна быць удзельнікам і пачуць з першых вуснаў канцэптуальна выверанную пазіцыю, можа, недзе паспрачацца, абмеркаваць і выпрацаваць канчатковы курс развіцця краіны на наступную пяцігодку».

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

КРОК ДА САДКА — КРОК ДА ЛЮДЗЕЙ

Просьба жыхароў, якія агучвалі жаданне вадзіць дзяцей у садок побач з домам, была выканана ў самыя сціслыя тэрміны. Такія запыты паступалі ў тым ліку падчас сустрэч на прадпрыемствах і ў арганізацыях Гомеля пяць гадоў таму — напярэдадні IV Усебеларускага народнага сходу.

У гомельскім дзіцячым садку №18 хрустальны звон раздаецца немаведама адкуль. Праз хвіліны знаходзіцца адгадка: у музычнай зале малыя граюць... на куфлях і фужэрах. Пад кіраўніцтвам крэатыўнага музычнага работніка дзеці ствараюць гарманічныя мелодыі, якія збіраюцца прадэманстраваць бацькам у якасці падарунка. Дарэчы, сам дзіцячы садок чатыры гады таму стаў падарункам усім жыхарам мікрараёна Мельнікаў Луг, які актыўна будуецца і сёння. Садок стаў доўгачаканым і вельмі запатрабаваным, бо менавіта тут жыве вялікая колькасць маладых сем'яў, у якіх, вядома ж, нараджаюцца дзеткі.

Неабходнасць у будаўніцтве была быццам бы відавочнай. Аднак тэрмінова ажыццявіць яе стала магчымым пасля таго, як людзі агучылі сваё пажаданне спачатку на прыёмах адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля. А потым тагачасныя кіраўнік адміністрацыі Іван Барадзінчык (цяпер старшыня Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў) і начальнік аддзела адукацыі Алег Леўшуноў (цяпер дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь) абгрунтавалі важнасць пабудовы падчас правядзення IV Усебеларускага народнага сходу ў канцы 2010 года.

Расказвае галоўны спецыяліст аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля Таццяна Ус:

— Была неабходнасць будаўніцтва дашкольнай установы, якая знаходзіцца ў крокавай блізкасці ад месца пражывання. У сувязі з запытамі жыхароў мікрараёна, а таксама выконваючы даручэнне Прэзідэнта, у 2010 годзе была закладзена першая цагліна ў падмурак гэтага дзіцячага садка, а 9 мая 2012 года тут урачыста адзначылі ўваходзіны. Дзіцячы садок будаваўся выключна за бюджэтныя грошы і ў цэнах 2012 года каштаваў Br67 млрд.

Гэта самы звычайны садок для самых звычайных дзетак. За чатыры гады амаль пяць тысяч квадратных метраў абжылі і пачалі з задавальненнем карыстацца ўсімі «наваротамі». Згадзіцеся, далёка не паўсюль медыцынскі блок займае амаль паўпаверха і ўкамплектаваны ўсім самым сучасным абсталяваннем. У садку вельмі прасторная спартыўная зала, у якой палову месца займаюць спецыяльныя трэнажоры для самых маленькіх. Незвычайная чаша басейна выканана па італьянскіх тэхналогіях. Садок атрымаўся ўзорным.

Менавіта таму сюды і цяпер, праз чатыры гады пасля адкрыцця, імкнуцца ўладкаваць сваіх дзетак бацькі. Марыя Вягера водзіць двухгадовага Даню ў групу адаптацыі. Кажа, што ёй вельмі зручна, бо дарога займае ўсяго пяць хвілін. Даня пад наглядам матулі на самакаце сюды прыязджае:

— Прыемна хадзіць у гэты садок. Вельмі падабаецца выхавальніца, якая з намі займаецца. Адчуваецца, што чалавек любіць сваю працу. Да таго ж тут ёсць усё, што неабходна дзецям: спартыўная і музычная залы, дзіцячыя трэнажоры і ўвесь неабходны інвентар.

Сяргей Кісялёў — тата ў дэкрэце. І таму гэта яго справа — скакаць разам з маленькім Макарам праз скакалку. Мы засталі бацьку з сынам за гэтай важнай справай. Хлопчыку хутка споўніцца тры гады і ён з адаптацыйнай групы пойдзе ў звычайную малодшую.

— Мы ў суседнім двары жывём, — кажа Сяргей, — тут сапраўды ёсць усё, што трэба для дзяцей і бацькоў. Вельмі многа цацак, у тым ліку тых, якія развіваюць малых. Тут можна падабраць неабходны і цікавы занятак для кожнага дзіцяці: і маляванне, і фізічныя і развіваючыя гульні.

Намесніца загадчыцы дзіцячага садка №18 Таццяна Курзова з задавальненнем паказвае ўжо абжытую тэрыторыю сваёй установы, пабудаванай па самым сучасным праекце. Кажа, такіх толькі тры па ўсёй Беларусі:

— У нас цяпер працуе 74 чалавекі. Акрамя тэхперсаналу і выхавальнікаў, штат укамплектаваны псіхолагам, настаўнікамі-дыфектолагамі, кіраўнікамі фізічнага і музычнага выхавання, медыкамі. Усе заўважаюць, як тут утульна. Птушкі і рыбкі, а таксама разнастайныя творчыя работы дзяцей і педагогаў не толькі ўпрыгожваюць памяшканне, але і ствараюць добры настрой. Добраўпарадкавана сіламі педагогаў і тэрыторыя навокал.

Праўда, у садку сёння не 230 запланаваных выхаванцаў, а амаль 300, бо ўсё роўна яшчэ не знята пытанне запатрабаванасці месцаў у дашкольных установах. Хаця, гаворыць галоўны спецыяліст аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля Таццяна Ус, праблема існуе менавіта ў мікрараёнах-новабудоўлях, а не ўвогуле па горадзе:

— Дзеці без месцаў у садках не застаюцца. Проста бацькам прапануюць месца не побач з домам, а каля работы ці ля дома іншых сваякоў. Забяспечваецца падвоз мясцовых дашкольнікаў да ўстаноў, якія знаходзяцца ў мікрараёне Стары Аэрадром па так званым «бацькоўскім маршруце». Сёння ў мікрараёне Мельнікаў Луг чатыры дашкольныя ўстановы. У кожнай каля 300 дзетак. Адкрыццё гэтага садка многім палегчыла жыццё. Цяпер плануецца будаўніцтва яшчэ адной дашкольнай установы. Пляцоўка закладзена, але работы пакуль не пачыналіся. Дарэчы, яшчэ адна дашкольная ўстанова магла б вырашыць праблему з дзіцячымі садкамі ва ўсім раёне новабудоўляў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

НА КАРЫСЦЬ ДЗВЮХ КРАІН

Віктар Гумінскі сустрэўся з шэрагам высокапастаўленых кітайскіх чыноўнікаў

Сёння — апошні дзень візіту намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктара Гумінскага ў Ганконг (Кітайская Народная Рэспубліка). Нагадаем, віцэ-спікер ніжняй палаты ўдзельнічае ў форуме «Адзін пояс, адзін шлях».

Учора Віктар Гумінскі сустрэўся са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжанам Дэцзянам. Як паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, «бакі з задавальненнем адзначылі высокі ўзровень палітычнага даверу, умацаванне ўсебаковага стратэгічнага партнёрства ва ўсіх галінах на карысць дружалюбных народаў Беларусі і Кітая». «Абмеркаваны пытанні рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», — гаворыцца ў прэс-паведамленні. — Чжан Дэцзян адзначыў гістарычны характар візіту ў Беларусь Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і выказаў упэўненасць у поспеху стварэння Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, які павінен стаць важным пунктам апоры праекта. Віктар Гумінскі пацвердзіў раней накіраванае запрашэнне Чжану Дэцзяну ад імя кіраўніцтва парламента Беларусі наведаць рэспубліку з афіцыйным візітам».

Падчас знаходжання ў Ганконгу намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў сустрэўся таксама са старшынёй Заканадаўчага сходу спецыяльнага адміністрацыйнага раёна Сянган (Ганконг, КНР) Дж. Цангам, а таксама правёў перамовы з намеснікам міністра гандлю і прамысловасці Ганконга Філіпам Юнгам.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

Прамая лінія

Усё, што вы хацелі даведацца пра пенсіі

Ці павялічыцца перадпенсійны тэрмін, у якім працадаўца не мае права не падоўжыць вам кантракт? Як будуць плаціць пенсію тым, хто працаваў за мяжой? Калі будуць выходзіць на пенсію ваенныя і міліцыя? Якая выслуга гадоў зараз будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні вам адкажуць **спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння ДРОНАВА Алена Уладзіміраўна і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства САМАДУМСКАЯ Аляксандра Вітальеўна** — падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў «Звяздзе» **сёння з 11.00 да 12.00.**

Тэлефануйце: 8 (017) 287-18-71

Папярэднія пытанні можна задаць па тым жа тэлефоне сёння з 9.00 да 11.00 або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

■ Грошы

Мех старых банкнот у ліпені без пашпарта не абмяняюць

Пасля дэнамінацыі пры абмене грошай узору 2000 года на суму ад 1 тысячы базавых велічынь і больш кліенту неабходна будзе прад'явіць пашпарт ці іншы ідэнтыфікацыйны дакумент. Гэтая інфармацыя размешчана на сайце Нацбанка.

Увогуле, ажыццяўленне фізічнай асобай падобнай фінансавай аперацыі (абмену) з наяўнымі грашыма **на суму ад 210 млн рублёў** старога ўзору з'яўляецца падставай для правядзення ідэнтыфікацыі кліента. Адпаведнае тлумачэнне змяшчаецца ў лісце Нацбанка ў адказ на зварот Асацыяцыі беларускіх банкаў наконт прымянення заканадаўства ў сферы прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, пры абмене грашовых сродкаў у сувязі з дэнамінацыяй. У прыватнасці, у лісце рэгулятара гаворыцца, што калі банку невядомая крыніца паходжання сродкаў кліента, то Нацбанк рэкамендуе кіравацца прыкметай падазронасці фінансавай аперацыі, якая прапісана ў інструкцыі пра патрабаванні да правілаў унутранага кантролю.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

СНД супраць тэрарызму

19-20 мая ў Мінску адбудзецца 40-е пасяджэнне Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД.

Як паведамляюць у прэс-службе Камітэта дзяржаўнай бяспекі, удзельнікі абмяркуюць уплыў сусветнага геапалітычнага становішча на бяспеку ў Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне, ход выканання праграмы супрацоўніцтва дзяржаў — удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў у барацьбе з тэрарызмам і іншымі гвалтоўнымі праявамі экстрэмізму на 2014—2016 гады, а таксама пытанні правядзення нарады кіраўнікоў нацыянальных антытэрарыстычных цэнтраў. Плануецца падвесці вынікі работы Антытэрарыстычнага цэнтра СНД за мінулы год, пасяджэння каардынацыйнага савета і тэхнічнага камітэта Аб'яднанага банка органаў бяспекі і спецслужбаў па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. Будуць абмяркоўвацца і вынікі пасяджэнняў камісій савета па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, інфармацыйнай бяспецы, супрацоўніцтве ў галіне папярэдняга следства, бяспекі міжнародных транспартных стасункаў.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■ Будзьце ў курсе!

АБМЕЖАВАННІ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ: АД «0+» ДА «18+»

Прадукцыя СМІ і кнігі цяпер будуць выходзіць з пазнакай узросту

Унесеныя змены ў законы Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці», «Аб сродках масавай інфармацыі», «Аб выдавецкай справе». Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Што лічыцца шкодным?

Так, паводле змен у Законе «Аб правах дзіцяці», прадугледжваецца абарона дзяцей ад інфармацыі, якая можа нанесці шкоду іх здароўю і развіццю. Гэта інфармацыя, якая:

выклікае жаданне ўжываць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, а таксама наркатычныя, псіхатропныя, таксічныя рэчывы, іх аналагі, вырабы з тытуню;

падахвочвае да здзяйснення злачынства і іншага дзеяння, небяспечнага для грамадства, у тым ліку да заняткаў прастытуцыяй, удзелу ў азартных гульнях, дзеянняў, звязаных з вырабам, распаўсюджаннем парнаграфічных матэрыялаў ці прадметаў парнаграфічнага характару;

станоўча ацэньвае злачынствы ці ідэалізуе злачынцаў, падштурхоўвае да паводзінаў, якія прыніжаюць годнасць чалавека, у тым ліку здзяйснення гвалту ў дачыненні да чалавека ці жывёл;

адлюстроўвае здзекі з чалавека ці групы людзей або іх прыніжэнне ў сувязі з этнічным паходжаннем, нацыянальнай, расавай, рэлігійнай, моўнай, палавой прыналежнасцю, перакананнямі або поглядамі, сацыяльным становішчам, захворваннямі;

падтрымлівае або станоўча ацэньвае жорсткасць, фізічны, псіхалагічны ці сексуальны гвалт, сексуальную эксплуатацыю, сексуальныя зносіны з удзелам дзяцей;

заахвочвае да нанясення цялесных пашкоджанняў ці самагубства, апісвае сродкі ці ўмовы самагубства;

змяшчае методыкі або іншыя матэрыялы аб спосабах вырабу небяспечных для жыцця і здароўя людзей прадметаў і іх выкарыстання;

падтрымлівае звычкі, якія супярэчаць фарміраванню здаровага ладу жыцця;

змяшчае нецэнзурныя словы і выразы, дыскрэдытуе інстытут сям'і і шлюбна-сямейныя адносіны;

мае застрашлівы характар, у тым ліку прадстаўляе ў выглядзе выяў ці апісання прыніжэнне чалавечай годнасці, смерці, няшчаснага выпадку, аварыі, катастрофы, хваробы і іх наступстваў;

змяшчае парнаграфічныя матэрыялы і (або) эротыку.

Інфармацыя — універсальная ці спецыфічная?

Таму для абароны дзяцей ад інфармацыі падобнага кшталту закон цяпер забараняе распаўсюджанне інфармацыйнай прадукцыі — а гэта прадукцыя СМІ, друкаваныя выданні, аўдыявізуальныя творы, гульні, праграмы, звесткі, што распаўсюджваюцца падчас культурных мерапрыемстваў, — без прысвоення знака ўзроставай катэгорыі. Такім знакам можа служыць гукавое і (або) візуальнае папярэджанне, што ўказвае на ўзроставую катэгорыю дзяцей, сярод якіх дапускаецца распаўсюджанне дадзенай інфармацыйнай прадукцыі.

У залежнасці ад жанру, тэматыкі, зместу і мастацкага афармлення інфармацыйнай прадукцыі, ёй прысвойваюцца наступныя знакі ўзроставай катэгорыі: «0+» (універсальная), «6+», «12+», «16+», «18+». Крытэрыі вызначэння ўзроставай катэгорыі ўстанаўліваюцца ўрадам Рэспублікі Беларусь. Для каардынацыі дзеянняў, накіраваных на абарону дзяцей ад шкоднай інфармацыі, пры ўрадзе краіны ствараецца спецыяльны грамадска-кансультацыйны савет.

Узроставыя абмежаванні будуць ужывацца і ў дачыненні да інтэрнэт-прадукцыі. Так, уладальнікі камп'ютарных клубаў, інтэрнэт-кавярняў павінны будуць выкарыстоўваць праграмныя, праграмна-апаратныя сродкі, што дазваляюць не дапусціць распаўсюджання сярод дзяцей інфармацыі, якая можа нанесці ім шкоду. Такія ж метады абмежавання доступу да небяспечных сайтаў могуць выкарыстоўвацца і пры карыстанні інтэрнэтам дома.

Адметна, што выдаўцы, вытворцы інфармацыйнай прадукцыі не маюць права распаўсюджваць прадукцыю без знакаў абмежавання ўзросту, але могуць самастойна прысвойваць ёй узроставую катэгорыю мэтавай аўдыторыі ў адпаведнасці з распрацаванымі крытэрыямі.

Не ўсе СМІ Беларусі будуць выходзіць з пазнакамі ўзросту. Неабавязкова пазначаць тэле-і радыёперадачы, што транслююцца ў прамым эфіры; тэле-і радыёперадачы інфармацыйнага, інфармацыйна-аналітычнага, культурна-асветніцкага, спартыўнага і духоўна-асветніцкага характару; замежныя тэле- і радыёпраграмы, якія транслююцца ў Беларусі без змены формы і зместу; друкаваныя СМІ, што спецыялізуюцца на распаўсюджванні інфармацыі агульнапалітычнага, навуковага, вытворча-практычнага, масава-палітычнага, афіцыйнага, духоўна- і культурна-асветніцкага, даведачнага, рэфератыўнага і статыстычнага характару; інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, якія распаўсюджваюцца праз інтэрнэт.

Якая карысць змен?

Адметна, што айчынныя выдаўцы ўжо даўно выпускаюць кнігі з пазнакамі, для дзяцей якога ўзросту яны прызначаюцца. Цяпер узроставае абмежаванне аўдыторыі стане больш ярка паказаным; так бацькі, настаўнікі змогуць больш пільна сачыць за тым, што чытае дзіця, якія праграмы глядзіць.

На думку **міністра інфармацыі Ліліі АНАНІЧ**, мэта змен — прыняцце комплексу захадаў па абароне дзяцей ад інфармацыі, якая можа нанесці шкоду іх здароўю, развіццю, маральнасці. Натуральна, усіх праблем маркіроўка прадукцыі не вырашыць, але гэта толькі першы крок. «Грамадства і дзяржава бяруць заканадаўчы курс на абарону дзяцей ад уздзеяння шкоднай інфармацыі. Такая прадукцыя не накіравана на фарміраванне ўсебакова развітай, духоўна і маральна сфарміраванай асобы і праз уздзеянне на дзіцячую псіхіку можа прывесці да негатыўных наступстваў», — сцвярджае Лілія Ананіч.

Цалкам са зместам Закона «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь» можна азнаёміцца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале краіны pravo.by.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■

■ Ну і ну!

Украў з сейфа 55 мільёнаў

і спусціў іх у гульнявых клубах

Супрацоўнікі сталічнага крымінальнага вышуку затрымалі маладога чалавека, які скраў са «стала заказаў» СТА 55 мільёнаў рублёў, якія патраціў у гульнявых клубах.

— Ад уладальніка станцыі тэхнічнага абслугоўвання паступіла заява: зламыснік ноччу патрапіў у памяшканне і ўкраў з сейфа грошы. Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства быў затрыманы аўтаслесар гэтай жа СТА, — расказала прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Тацяна АБОЗНАЯ. — Устаноўлена, што малады чалавек мае гульнявую залежнасць. У дзень злачынства ён выпіваў, пасля чаго выправіўся ў клуб. Там на аўтаматах прайграў усе грошы, аднак гэта яго не спыніла. Хлопец паехаў на месца працы, разбіў шкло ў акне будынка, ускрыў ломам дзверы «стала заказаў», адчыніў сейф і забраў грошы: частку зарплаты супрацоўнікаў, сродкі заказчыкаў і асабістыя — дырэктара. Пасля чаго з гэтымі мільёнамі вярнуўся ў гульнявы клуб, дзе патраціў частку грошай, а тое, што засталося, «спусціў» у іншай забаўляльнай установе. Затрыманаму 30 гадоў, раней да крымінальнай адказнасці ён не прыцягваўся. Цяпер яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■

АКЦЭНТ — НА МАКСІМАЛЬНУЮ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Сёлета айчыннай энергасістэме спаўняецца 85 гадоў. У юбілейны год профільнае міністэрства вырашыла паказаць грамадскасці сапраўды сучасны стан галіны. Днямі карэспандэнт нашага выдання пабываў на знакавых аб'ектах энергетыкаў Мінскай вобласці. Паездка была арганізавана пры падтрымцы прэс-службы Міністэрства энергетыкі Беларусі.

Беларускай энергасістэме — 85 гадоў

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ, РАБОТНІКІ І ВЕТЭРАНЫ ЭНЕРГЕТЫЧНАЙ ГАЛІНЫ БЕЛАРУСІ!

Ад імя Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белэнерга» віншую вас са знамянальнай падзеяй — 85-годдзем беларускай энергасістэмы.

Восемдзесят пяць гадоў таму адбылася знакавая падзея для энергетыкі нашай краіны. Паступова, па крупінках, у адзін вялікі арганізм збіралася магутная, устойлівая і добра кіраваная энергетычная сістэма. У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ўмацоўваліся міжсістэмныя абласныя сувязі, будаваліся высакавольтныя лініі электрапередачы, адбудоўвалася аўтаматыка і ўкаранялася тэлемеханіка. Далейшае развіццё беларускай энергасістэмы непарыўна звязана з узвядзеннем буйных ЦЭС, ГРЭС, што стала стымулам для развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі і вывела рэспубліку на першыя пазіцыі па многіх напрамках у Савецкім Саюзе.

У 1970-х гадах энергетыка Беларусі ўступіла ў якасна новую фазу развіцця. Асноўная задача — інтэнсіфікацыя і павышэнне эфектыўнасці энергетычнай вытворчасці энергасістэмы — паспяхова вырашалася. Адначасова значна ўскладнялася і структура энергагаспадаркі. Паўстала пытанне аб пераводзе кіравання энергасістэмы на навуковую аснову. Пачынаючы з 1975 года, для вырашэння асноўных задач вытворча-гаспадарчай дзейнасці энергасістэмы стваралася база для ўкаранення АСК энергетычнай вытворчасцю.

У гады сучаснай гісторыі развіцця энергасістэмы пры мадэрнізацыі энергакрыніц перавага была аддадзена сучасным парагазавым тэхналогіям. У адпаведнасці з канцэпцыяй энергетычнай бяспекі краіны хуткімі тэмпамі стала развівацца аднаўляльная энергетыка. Арганізацыі энергасістэмы трымаюць руку на пульсе сучасных кірункаў развіцця. Уводзяцца ў эксплуатацыю новыя міні-ЦЭЦ, якія працуюць на мясцовых відах паліва, будуюцца гідраэлектрастанцыі і ветрапаркі, падключаюцца ўстаноўкі, пабудаваныя інвестарамі.

Пры мадэрнізацыі і будаўніцтве новых энергетычных аб'ектаў вялікая ўвага надаецца пытанням энергазберажэння, эканоміі ўсіх відаў рэсурсаў і зніжэння выдаткаў, выкарыстанню мясцовых відаў паліва.

Беларуская энергетычная сістэма за 85 гадоў прайшла слаўны шлях развіцця, на якім быў рэалізаваны не адзін значны праект і ўнесены бясцэнны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай дзяржавы.

Але колькі б мы ні казалі пра дасягнутае за амаль векавую гісторыю, факты і лічбы, хацелася б адзначыць самае каштоўнае, што ёсць у нашай энергасістэме, — гэта выдатны калектыў аднадумцаў-энергетыкаў. Атрыманых дасягненняў удалося дамагчыся дзякуючы ўкладу ўсіх супрацоўнікаў энергасістэмы!

Залог нашага з вамі поспеху — няспынная пераемнасць пакаленняў энергетыкаў, бясконцы абмен неацэнным вопытам у коле ветэранаў і маладых супрацоўнікаў. Таму ветэранам — асаблівая падзяка: іх самаадданай і шмат у чым цяжкай працай была створана і працягвае развівацца беларуская энергетычная сістэма.

Высокі прафесіяналізм, унікальны вопыт, выдатныя працоўныя традыцыі энергетыкаў — усё гэта не толькі гарантыя надзейнага забеспячэння Беларусі энергарэсурсамі, але і залог паспяховай рэалізацыі самых смелых праектаў у будучыні.

Прыміце ў гэты ўрачысты дзень пажаданні вам, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, удачы і поспехаў у справах!

Генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга» Я.А. ВОРАНАЎ.

САМАЕ СУЧАСНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

У Барысаве, на адным з падраздзяленняў Жодзінскай ЦЭЦ, быў паспяхова рэалізаваны інвестпраект з удзелам Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця (МБРР). На месцы былой кацельні ў 2014 годзе з'явілася сучасная станцыя з найноўшым еўрапейскім абсталяваннем.

Інвестыцыйны праект па рэканструкцыі кацельні прадугледжваў пераўтварэнне яе ў ЦЭЦ. Праз рэалізацыю гэтага плана адбылося ўкараненне энергаэфектыўнага абсталявання.

Тэндар на будаўніцтва Барысаўскай ЦЭЦ выйграла расійская кампанія «Е-4» пры ўмове, што аб'ект будзе здадзены «пад ключ»: праектаванне, набыццё абсталявання, будаўніцтва, а таксама выкананне пусканаладачных работ кампанія-забудоўшчык цалкам узяла на сябе. Рэалізацыя праекта запатрабавала ад кампаніі крэдытных рэсурсаў МБРР у памеры 87 млн долараў і бюджэтных сродкаў нашай краіны ў аб'ёме каля 20 млн долараў.

Галоўны інжынер Жодзінскай ЦЭЦ Сяргей ДАЛАНАЎ адзначыў, што ўсё было выканана ў тэрмін і 22 снежня 2014 года Барысаўская ЦЭЦ уведзена ў эксплуатацыю. Ён лічыць, што гэтую станцыю смела можна назваць сучасным энергаэфектыўным аб'ектам, бо толькі за 2015 год тут было сэканомлена каля 45 тысяч тон умоўнага паліва, або каля 6,5 млн долараў бюджэтных сродкаў.

А сёння на тэрыторыі Барысаўскай ЦЭЦ функцыянуе парагазавы блок магутнасцю 65 МВт. У яго склад уваходзяць паратурбінныя ўстаноўкі з Чэхіі, кацёл-утылізатар (Славакія), газавыя кампрэсарныя ўстаноўкі (Англія), градзірня вентыляцыйнага тыпу (Чэхія) і камплектная размеркавальная прылада напружаннем 110 кВ.

З моманту ўводу ў эксплуатацыю Барысаўскай ЦЭЦ ПГУ-65 МВт на станцыі было выпрацавана больш за 475 млн кВт.г. Фактычны ўдзельны расход умоўнага паліва на водпуск электраэнергіі склаў 203 грам/кВт.г. Для параўнання, удзельны расход умоўнага паліва на водпуск электраэнергіі па энергасістэме краіны за 2015 год склаў 235,5 грам/кВт.г.

ВЫХАД НА ПОЎНУЮ МАГУТНАСЦЬ — УЖО СЁЛЕТА

Паводле слоў **начальніка Барысаўскай ЦЭЦ Дзмітрыя КОРШУНА**, кацёл-утылізатар здымае цяпло непасрэдна з дымавых газаў, паколькі ў яго канструкцыі адсутнічае камера згарання. Ва ўстройстве катла — два барабаны (высокага і нізкага ціску). Выпрацоўка пары — 58 тон у гадзіну па высокім ціску, 12 тон у гадзіну — па нізкім. Для параўнання, у звычайных паравых катлах газ падводзіцца да спецыяльных гарэлак, дзе і спальваецца.

Дырэктар Жодзінскай ЦЭЦ Аляксандр МЫЦЬКО ўпэўнены, што эфектыўнасць станцыі будзе яшчэ павышана. Справа ў тым, што сёння Барысаўская ЦЭЦ працуе выключна на гарачае водазабеспячэнне, маючы пры гэтым куды большы патэнцыял: нагрузка на гарачае водазабеспячэнне складае парадку 19 гігакалорыяў, а намінальна магчымы водпуск на ЦЭЦ — 38 гігакалорыяў. Дарэчы, па цяпле станцыя цалкам не загружана: частку яго тут скідваюць на градзірні. Каб станцыя працавала на поўную магутнасць і зімой, і летам, вядзецца будаўніцтва цеплатрасы і дадатковага кацельнага цэха, якія прадугледжаны для працы ў пікавай магутнасці. Увядзенне ў эксплуатацыю новых аб'ектаў запланавана ўжо сёлета на чэрвень.

І АЎТАМАТЫКАЙ КІРУЮЦЬ ЛЮДЗІ

Супрацоўнікі, якія займаліся будаўніцтвам і наладкай абсталявання на ЦЭЦ, сёння складаюць касцяк персанала. Гэта цяпер, а непасрэдна перад здачай аб'екта электрацэнтралі неабходна было вырашаць праблему недахопу высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія стануць абслугоўваць складаную тэхніку.

«Але мы хутка перавучылі частку старых супрацоўнікаў, потым узялі яшчэ 35 маладых спецыялістаў. Навучанне праводзілі замежныя эксперты. А цяпер усе нашы спецыялісты тут з вышэйшай адукацыяй. Але бяром людзей не проста з дыпломамі, а з мазгамі, — расказвае Сяргей Даланаў. — Цяпер да нас прыходзіць шмат моладзі. Недахопу ў работніках мы не адчуваем. Больш за тое, на станцыі ўведзены жорсткі конкурсны адбор».

Кіраванне новым блокам і старой кацельняй ажыццяўляе аператыўны персанал з 14 чалавек, з якіх на пульце кіравання энергаблокам знаходзяцца начальнік змены электрастанцыі, начальнік змены катлатурбіннага цэха, начальнік змены электрацэха, машыніст энергаблока, старшы машыніст энергаблока і старшы дзяжурны электраманцёр.

Працэс кіравання энергаблокам аўтаматызаваны. На дысплеях камп'ютараў адлюстроўваецца ўся значная для працы кіраўніка і персаналу інфармацыя — тэхналагічны працэс выпрацоўкі энергіі: пункт падрыхтоўкі газу, газавая турбіна, кацёл-утылізатар, паравая турбіна і выдача яе магутнасці, нагрузка і інш.

Для забеспячэння спажыўцоў цеплавой энергіяй у турбіне ЦЭЦ арганізаваны цеплавы адбор. У размеркавальным абсталяванні знаходзіцца дзве сістэмы шын, кожная з якіх працуе пад напружаннем 110 кВ. Непасрэдна сюды пасля трансфарматара па дзвюх кабельна-паветраных лініях электраэнергія паступае ў Барысаў і далей — у агульную энергасістэму.

Таксама пры рэалізацыі праекта Барысаўскай ЦЭЦ быў пабудаваны тэхнічны вадавод, які бярэ ваду з ракі Бярэзіна. Вада праходзіць хімічную ачыстку і апрацоўку ў рамках установленага на станцыі абсталявання.

Кіраўніцтва Барысаўскай ЦЭЦ адзначыла, што за год эксплуатацыі станцыі не было ніводнага сур'ёзнага збою. Увогуле, тут створаны ўсе ўмовы для працы, прафесійнага развіцця і прафесійнага росту супрацоўнікаў, якія, паводле слоў начальніка Барысаўскай ЦЭЦ, з'яўляюцца гарантам жыццядзейнасці станцыі.

УНІКАЛЬНЫ ПРАЕКТ — МІНСКАЯ ЦЭЦ-5

Спроба перайсці на ядзерную энергетыку ў Беларусі ўжо была ў 1981 годзе. Тады ў Пухавіцкім раёне (40 кіламетраў ад Мінска) быў з нуля пабудаваны пасёлак энергетыкаў, цяпер Дружны. Але аварыя на Чарнобыльскай АЭС перакрэсліла ўсе планы. Пасля катастрофы будоўлю на некалькі гадоў замарозілі. Пазней на гэтым месцы было вырашана запусціць Мінскую ЦЭЦ-5.

Галоўны інжынер ЦЭЦ-5 Валерый ДЗЕГЦЯРОЎ адзначае, што летась на станцыі правялі рамонт першага энергаблока, што дазволіла знізіць выдаткі паліва на выпрацоўку электраэнергіі.

Другі энергаблок станцыі быў уведзены ў эксплуатацыю ў 2012 годзе. Гэта стаў сумесны беларуска-кітайскі праект коштам каля 260 мільёнаў еўра. Аб'ект будавалі пад ключ спецыялісты з Паднябеснай. Яны выйгралі тэндар у расіян.

Валерый Дзегцяроў лічыць, што другі энергаблок уяўляе сабой сапраўды ўнікальны праект, бо ў бліжэйшы такі рэалізаваны толькі ў Баку. А ў нас у краіне яшчэ няма такой сістэмы, каб на адным вале размяшчаліся адразу і газавая, і паравая турбіны, і кампрэсар, і генератар. Абсталяванне важыць каля 180 тон і дасягае 60 метраў у даўжыню.

ЦЭЦ-5 сёння працуе на газе. Праўда, можа працаваць і на мазуце. Гэта рэзервовае паліва.

«Пасля пуску АЭС будзе зроблена адаптацыя ўсёй беларускай энергасістэмы. Таму на нашай станцыі прадугледжваецца будаўніцтва спецыяльных аб'ектаў, якія дапамогуць у выпадку аварыйнага адключэння атамнага блока. Яны на працягу кароткага часу павінны будуць уключыцца ў сетку і замясціць частку яго магутнасцяў. Тое ж самае будзе зроблена ў Лукомлі і Бярозе», — тлумачыць сітуацыю галоўны інжынер Мінскай ЦЭЦ-5.

Усяго сёлета за першы квартал ЦЭЦ выпрацавала 442 мільёны кілават-гадзін электраэнергіі. Акрамя таго, станцыя забяспечвае цяплом пасёлкі Дружны, Свіслач і Рудзенск. «У перспектыве прадугледжваецца, што Рудзенск стане горадам-спадарожнікам Мінска, куды будуць выносіцца прамысловыя прадпрыемствы. Таму ў нас з'явяцца дадатковыя спажыўцы энергіі і цяпла», — кажа Валерый Дзегцяроў.

Сяргей КУРКАЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.
kurkach@zviazda.by

УНП 101339243.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

19 МАЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15793)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Максім ОСІПАЎ:

«Поспех — гэта пытанне часу»

Заяўляць пра сябе гэты артыст спрабаваў па-рознаму. Спачатку ў яго быў інструментальны калектыў «Баззі Джокет» у стылі джаз-фанк, потым прыйшло разуменне, што хочацца рабіць іншую музыку і самому пісаць песні — так з'явілася група «Дэвайсы» (яна існуе вось ужо чацвёрты год). Паралельна яе саліст і стваральнік іграе ў вядомым гурце «Дразды», а таксама працуе як саўндпрадзюсар. Сустрэўшыся з Максімам Осіпавым, мы даведаліся, як ён сумяшчае творчасць і зараблянне грошай, па чым якасць песень і дзе знаходзіць рэцэпты натхнення.

— Я нарадзіўся і вырас не ў музычнай сям'і. Маці ў мяне працуе эканамістам, а бацька просты рабочы на заводзе, і яны ніяк не звязаны з творчасцю. Хоць мама (яна нарадзілася ў адзін дзень з Алай Пугачовай) некалі бачыла сны, як выступае на сцэне, іграе на розных інструментах. Аднак, паколькі яна расла ў вёсцы ў шматдзетнай сям'і, то ёй было не да заняткаў музыкай. Пайшла асвойваць больш практычную прафесію. Гэтак жа магло скласціся і ў мяне, бо ў дзяцінстве я марыў пра тое, як стану інжынерам-канструктарам аўтамабіляў. Мы тады яшчэ жылі ў Бабруйску, і я збіраўся паступаць у аўтамабільны каледж. Але потым наша сям'я пераехала ў Мінск, і на той момант у маё жыццё ўжо прыйшло захапленне гітарай. Мне было 12 гадоў — узрост, калі хлопцы збіраюцца разам і развучваюць песні, каб спадабацца дзяўчатам. Пачаў удзельнічаць у аматарскіх гуртах. Жыў літаральна ад рэпетыцыі да рэпетыцыі. А неяк маці расказала, што аб'яўлены набор у музычны каледж і пацікавілася, ці не жадаю я пайсці туды... Я згадзіўся, і з таго моманту маё жыццё назаўсёды змянілася. За лета падрыхтаваўся да экзаменаў і паступіў на клас класічнай гітары. А вось універсітэт культуры і мастацтваў заканчваў ужо па класе эстраднай электрагітары. Быў перыяд, калі ў гэтых навучальных установах нават два гады працаваў выкладчыкам.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Сакрэты майстэрства

«АБРЫЎ» З-ПАД КУПАЛА,

або Калі адсутнічае СТРАХоўка

...У Белдзяржцырку людзей сёння няма — наступнае прадстаўленне адбудзецца заўтра. У зале толькі адзін глядач, і гэта я. У абсалютнай цішыні ў цэнтр арэны выходзіць мініяцюрная дзяўчына. У яе руках рэквізіт: некалькі вялікіх цыліндраў са шклапластыку (як мы пазней даведаемся, яны называюцца «цыгарамі»), крэсла на доўгіх ножках (па-цыркавому — «антыпод») і некалькі хустак. У дваццацігадовай гімнасткі-эквілібрысткі Алены КЛІМОВІЧ чарговая рэпетыцыя, паназіраць за якой напрасіліся і мы. Мэта візіту — распытаць пра асаблівасці прафесіі цыркача і даведацца, як у яе трапляюць новыя людзі.

Першае практыкаванне сённяшняй рэпетыцыі — антыпод. Алена кладзецца на крэсла ўніз галавой і пачынае рабіць нагамі такія рэчы, якія большасць з нас наўрад ці зробіць нават пры дапамозе рук: яна раскручвае і падкідвае «цыгары», жангліруе імі. Працэс цягнецца вельмі доўга, і гэта ўражвае — паспрабуйце проста вертыкальна патрымаць ногі ў паветры хоць бы хвіліны дзве-тры і зразумееце, пра што я кажу. Відовішча неверагоднае, але далей — болей. Дзяўчына бярэ ў рукі другі цыліндр, таксама раскручвае яго, падкідвае ў паветра і ловіць... Наступнае практыкаванне вельмі падобнае, але ў якасці рэквізіту выкарыстоўваюцца хусткі. Дзяўчына прыдае ім кручэнне, за кошт чаго плоская тканіна трымаецца на яе нагах, і цяпер жангліруе ўжо хусткамі.

— Я была вельмі няўрымслівым дзіцем, — кажа Алена. — Бацькам ад мяне ніколі жыцця не было, увесь час «на вушах хадзіла». Першай не вытрымала бабуля — у пяць гадоў узяла за руку і адвяла ў новую цыркавую студыю, якая толькі-толькі адкрылася ў маёй роднай Оршы. З будучай «спецыялізацыяй» вызначылася хутка — як толькі прыбегла ў залу, адразу ж палезла на канат. Вось і

Антыпод — адзін з «выміраючых» жанраў цыркавога мастацтва.

Фота Надзеі БУЖАН.

атрымалася, што стала гімнасткай. Але энергіі ўсё адно было зашмат — давялося весці мяне яшчэ і на танцы.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Эксперымент у дзеянні

ПЕРШАКУРСНІКАЎ — ПАД АПЕКУ!

Развіваць прафесійныя кампетэнцыі будучым педагогам дапамагае цьютарства

Па статыстыцы, кожны год з першага курса ВНУ адлічваецца ў сярэднім каля 8-10 працэнтаў студэнтаў. Прычыны могуць быць самыя розныя: ад сумненняў у правільнасці выбранай спецыяльнасці да элементарнай неарганізаванасці першакурсніка і, як вынік, яго акадэмічнай непаспяховасці. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце ў гэтым навучальным годзе з першага курса адлічаны 61 чалавек, што складае 4,6% ад колькасці першакурснікаў і амаль трэць ад усіх адлічаных. Нядаўна ў БДПУ падвялі вынікі гадавой работы па развіцці студэнцкага цьютарства.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Учарашнія школьнікі, якія паступілі ў ВНУ, трапляюць у зусім новы і нязвыклы для іх свет. Ёсць істотная розніца паміж школьным і ўніверсітэцкім падыходам да навучання, — падкрэслівае **рэктар БДПУ імя Максіма Танка, прафесар Аляксандр ЖУК**. — Студэнтам даецца больш свабоды, якой яшчэ трэба навучыцца распараджацца. Новае месца навучання і патрабаванні, нязвыклы рытм жыцця, незнаёмыя людзі... Незразумела, да каго звяртацца па параду і падтрымку. Няцяжка здагадацца, што праблемы, звязаныя з адаптацыяй, тармозяць і працэсы навучання. Таксама першакурснікі страчваюць магчымасць адразу ўліцца ў пазавучэбнае студэнцкае жыццё, якое стартуе адначасова з пачаткам навучальнага года.

Гэта пацвярджаюць і вынікі анкетавання першакурснікаў БДПУ. Каля паловы з іх канстатавалі цяжкасці ў працэсе адаптацыі да навучання ў ВНУ: загружанасць вучэбнымі заняткамі, псіхалагічныя перагрузкі, нездавальняючыя ўмовы пражывання, бытавую неўладкаванасць, неарганізаванасць і раз'яднанасць вучэбнай групы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
19 05 2016 г.

Свой выбар

УНІВЕРСІТЭЦКІ КІРМАШ ПРАФЕСІЙ

Усе ВНУ — на адной пляцоўцы

Днямі ў сталічным Палацы спорту адбылося знакавае для сферы адукацыі мерапрыемства — на адной пляцоўцы сабраліся прадстаўнікі ўсіх 52 вышэйшых навучальных установаў краіны.

— Галоўная мэта Рэспубліканскай універсітэцкай суботы — паказаць абітурыентам і школьнікам, якія яшчэ толькі будуць рабіць свой выбар, увесь спектр нашых вышэйшых навучальных устаноў, — расказаў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**. — Вельмі часта даводзіцца чуць пра тое, што школьнікам хацелася б параўнаць розныя ўніверсітэты, але для гэтага трэба нанесці візіт у кожны з іх. Тут жа мы даём ім магчымасць у адным месцы пазнаёміцца з усімі ВНУ краіны, іх факультэтамі, матэрыяльнай базай, паразмаўляць са студэнтамі і выкладчыкамі. Спадзяюся, што ўніверсітэцкая субота прыйдзецца даспадобы школьнікам і іх бацькам, і яна стане штогадовай.

— Мерапрыемства, безумоўна, вельмі важнае, вы можаце самі пабачыць гэта па колькасці наведвальнікаў, — падзялілася сваімі думкамі **начальнік галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай працы БДУ Людміла ХУХЛЫНДЗІНА**. — Пытанняў ад абітурыентаў шмат, але ў першую чаргу яны датычацца не столькі правілаў прыёму і залічэння, колькі нюансаў будучай прафесіі: заробку, магчымасці працаўладкавання пасля ВНУ. Шмат пытанняў наконт матэрыяльнай базы. Ёсць і зусім «дзіцячыя», накшталт «а ці вельмі строгія ў вас выкладчыкі?» Але мы ўсім абавязкова дапамагаем. Адзіная заўвага датычыцца часу правядзення ўніверсітэцкай суботы. Збольшага сёння да нас прыйшлі не выпускнікі, а старшакласнікі, бо першыя ў гэты час ужо звычайна ведаюць, куды будуць паступаць. Мне здаецца, што больш актуальным такое мерапрыемства было б увосень.

Завіталі ў Мінск і прадстаўнікі рэгіянальных універсітэтаў. Побач са стэндам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання заўсёды было шмат моладзі.

— Пераважную большасць наведвальнікаў хвалююць бытавыя пытанні, у прыватнасці магчымасць размяшчэння ў інтэрнаце, а таксама будучае працаўладкаванне, — расказала **дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі Алена АНДРЭЙЧЫКАВА**. — Ні з тым, ні з іншым у нашай ВНУ праблем няма, таму амаль усе сыходзяць задаволенымі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Галоўны плюс універсітэцкай суботы — прамы кантакт з выкладчыкамі і адміністрацыяй ВНУ.

Прадстаўнікі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны падышлі да самапрэзентацыі максімальна творча.

Цэлы сектар займалі ВНУ сілавых структур: Магілёўскага інстытута МУС, Інстытута пагранічнай службы, Ваеннай акадэміі. Па словах **прадстаўніцы апошняй Таццяны САСНОЎСКАЙ**, асаблівую ўвагу гэтай установе падчас універсітэцкай суботы ўдзялялі... дзяўчаты! «Для нас гэта мерапрыемства, пэўна, не настолькі актуальнае з-за часу яго правядзення, — зазначыла спецыяліст. — Справа ў тым, што медкамісія, без якой у Ваенную акадэмію не возьмуць, праходзіць яшчэ ў красавіку. Таму сёння працуем пераважна «на будучыню» — з вучнямі 9-х і 10-х класаў».

Міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ:

— Кошт навучання фарміруецца, зыходзячы з неабходных выдаткаў на падрыхтоўку спецыяліста. Усе тарыфы ў нас у краіне растуць. Вырасла стаўка першага разраду, камунальныя паслугі таксама падаражэлі. Я ўважліва сачу за выдаткамі ўніверсітэтаў. І па прадстаўленых звестках, на жаль, цяпер па платным навучанні практычна ўсе ВНУ маюць адмоўную рэнтабельнасць. У бліжэйшы час, мяркую, кожны ўніверсітэт уважліва разгледзіць гэтае пытанне і прадставіць ужо новы кошт зыходзячы з таго, каб навучанне не было стратным.

Ці была ўніверсітэцкая субота карыснай для саміх школьнікаў? Мяркуючы па водгуках, такога мерапрыемства ім сапраўды не хапала.

— Прыйшла сюды, каб канчаткова выбраць спецыяльнасць, па якой буду атрымліваць адукацыю, — гаворыць **адзінаццацікласніца Дар'я ДМУХОЎСКАЯ**, перабіраючы рукамі «ўлоў» з інфармацыйных буклетаў. — З профілем я вызначылася даўно — гэта павінна быць філалогія. Але ўніверсітэтаў, дзе гэтаму вучаць, шмат, шукаць інфармацыю пра кожны з іх у інтэрнэце не вельмі зручна. Тут жа атрымліваеш усё, што называецца, з першых рук.

— Я ведаю кірунак, па якім хачу вучыцца, толькі прыкладна, — дапаўняе **дзесяцікласнік Ілья ГАРКАВОЙ**. — Хутчэй за ўсё, звяжу сваё жыццё з ІТ. Вядома, лагічным рашэннем было б паступаць у БДУІР, але, можа быць, знойдзецца нешта не менш цікавае ў іншых ВНУ.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

Ведай нашых!

УСЕ «ВЫСТРАЛЫ»... БЕЗ ПРОМАХАЎ

Шэсць узнагарод рознай вартасці заваявалі беларускія школьнікі на 50-й міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі, якая завяршылася ў Маскве.

Мендзялееўская алімпіяда праводзіцца штогод і з'яўляецца пераемніцай Усесаюзнай хімічнай алімпіяды, працягваючы яе нумарацыю. У ёй прымаюць удзел навучэнцы выпускных і перадвыпускных класаў школ з ліку пераможцаў нацыянальных хімічных алімпіяд. Прызёры алімпіяды з краін СНД маюць права паступіць без экзаменаў у Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава.

Усе ўдзельнікі, незалежна ад таго, у якім класе яны вучацца, выконваюць адны і тыя ж заданні. Традыцыйна алімпіяда складаецца з трох тураў: першы тэарэтычны тур уключае 8 абавязковых задач, другі тэарэтычны тур — 5 задач з 15 на выбар удзельнікаў. Плюс эксперыментальны тур: ён праводзіўся ў лабараторыях хімічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава.

Усяго ў спаборніцтвах выступілі 114 школьнікаў старшых класаў з 21 краіны: Азербайджана, Арменіі, Балгарыі, Беларусі, Венгрыі, Грузіі, Казахстана, Латвіі, Літвы і іншых. Сёлета да Мендзялееўскай алімпіяды далучыліся новыя краіны — Ізраіль, Манголія і Нігерыя.

Залаты медаль па выніках інтэлектуальных спаборніцтваў заваяваў адзінаццацікласнік сталічнай гімназіі №13 Канстанцін Анісовіч. Сярэбраныя медалі — у адзінаццацікласніцы з гімназіі №1 г. Віцебска Ганны Клімковіч, вучня 11 класа СШ №47 г. Мінска Міраслава Макарэвіча і навучэнцаў выпускнога класа Ліцэя БДУ Рыгора Сіненкі і Рамана Ларковіча. «Бронза» — у яшчэ аднаго ліцэіста БДУ, дзесяцікласніка Рамана Мазура. Такім чынам ніводны ўдзельнік нашай зборнай не застаўся без узнагароды.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ПЕРШАКУРСНІКАЎ — ПАД АПЕКУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Праблематычнымі з'яўляюцца таксама такія аспекты навучання і жыццядзейнасці студэнтаў, як недастатковая матэрыяльная забяспечанасць (18%), адсутнасць неабходных умоў для самастойнай вучэбнай дзейнасці (17%), праблемы са здароўем (15%), складаны змест навучальных дысцыплін (13%), цяжкасці ў арганізацыі адпачынку і вольнага часу (10%).

Для больш паспяховай адаптацыі студэнтаў малодшых курсаў у БДПУ быў створаны інстытут куратарства. За кожнай вучэбнай групай замацоўваецца выкладчык-куратар, задача якога дапамагчы адаптавацца да новых умоў навучання. Аднак не кожны першакурснік мае смеласць падысці да куратара або да выкладчыка па параду, бо яны значна старэйшыя...

Як сведчыць анкетаванне, асобамі, у дапамозе якіх маюць патрэбу студэнты ў перыяд сваёй адаптацыі, з'яўляюцца найбольш блізкія людзі — бацькі, сваякі (54%), а таксама сябры (51%). Важная роля адводзіцца таксама аднакурснікам (25%), студэнтам старшых курсаў (22%) і куратару (23%). Нельга забывацца і пра тое, што каля 66% студэнтаў-першакурснікаў БДПУ з'яўляюцца непаўналетнімі.

Рашэннем рэктарата восенню мінулага года ў БДПУ была створана сістэма студэнцкага цьютарства на ўсіх факультэтах. На кожным факультэце была сфарміравана група студэнтаў-цьютараў (усяго іх 209 чалавек), якія паспяхова вучацца, актыўныя ў грамадскім жыцці і гатовыя аказваць дапамогу іншым студэнтам.

Варта адзначыць, што практыка студэнцкага цьютарства ўжо мелася ва ўніверсітэце, але яна тычылася пераважна арганізацыі студэнцкага самакіравання. Студэнты-старшакурснікі знаёмілі першакурснікаў з пазавучэбнай дзейнасцю і карпаратыўнай культурай універсітэта. А з гэтага года студэнты-цьютары сталі актыўна ўключацца і аказваць дапамогу студэнтам і ў вучобе і сацыяльнай адаптацыі.

Па сутнасці, студэнты-цьютары — гэта памочнікі куратара: у пэўнай ступені яны бяруць на сябе ролю куратара вучэбнай групы. Вядома, што ў цьютара няма такіх правоў, якімі валодае куратар, затое ёсць іншыя перавагі. Па-першае, дзякуючы невялікай розніцы ва ўзросце, ім прасцей наладзіць кантакт. Па-другое, самі цьютары яшчэ нядаўна сутыкаліся з аналагічнымі цяжкасцямі ў працэсе адаптацыі. Таму яны фактычна перадаюць свой студэнцкі вопыт групе. Па-трэцяе, стасункі паміж цьютарам і першакурснікамі не абмяжоўваюцца знаходжаннем ва ўніверсітэце: цьютарства можа працягвацца, напрыклад у інтэрнаце, а таксама праз анлайн-кансультаванне, зносіны ў сацыяльных сетках.

— У апошнія гады ў БДПУ павялічваецца колькасць замежных студэнтаў, што ставіць перад педагагічнымі работнікамі шэраг задач па іх адаптацыі і сацыялізацыі, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — Сёння ў нас навучаецца каля 520 замежных студэнтаў. Не сакрэт, што яны, акрамя цяжкасцяў у адаптацыі да новых умоў навучання ў ВНУ, адчуваюць яшчэ і моўныя цяжкасці, і складанасці культуралагічнага характару. Спадзяёмся, што ўзаемадзеянне замежных студэнтаў са студэнтамі-старшакурснікамі не толькі аблегчыць іх адаптацыю ў новай адукацыйнай прасторы, але і дапаможа асвоіцца ў новым культурным асяроддзі, вывучыць мову і павысіць іх паспяховасць.

— Наша каманда цьютараў працуе па чатырох кірунках і, адпаведна, дзеліцца на чатыры каманды: суправаджэнне першага курса; псіхалагічнае суправаджэнне; суправаджэнне па замежнай мове; суправаджэнне па вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці, — падзялілася сваім досведам цьютарскага суправаджэння **студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Лізавета САДОЎСКАЯ**.

«Сёння мы разумеем, што цьютарскае суправаджэнне карыснае не толькі для студэнтаў малодшых курсаў, але і для цьютараў, якія развіваюць свае прафесійныя кампетэнцыі. Менавіта досвед, што атрымліваецца ў ходзе цьютарскага суправаджэння, дапаможа сфарміравацца будучаму педагогу як спецыялісту. Таму цьютарскае суправаджэнне адукацыйнага працэсу павінна стаць арганічнай часткай сістэмы прафесійнай падрыхтоўкі будучага настаўніка», — дадаў Аляксандр Жук.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

МЕМАМ СЛОВА ЗАМЯНІЎШЫ

Слова «мем» стала ў інтэрнэт-прасторы сінонімам гумару вельмі нізкага ўзроўню і, адпаведна, не самага вялікага інтэлекту аматараў такіх жартаў. Мне ж хочацца выступіць у абарону праслаўтых «мемасікаў». І нават не таму, што я сам часам праводжу гадзіны, шукаючы на прасторах сеціва новыя смешныя малюнкі, а таму, што за апошнія гады яны сталі сапраўднай культурнай з'явай, на якую не звярнуць увагу немагчыма.

Спачатку варта, пэўна, у трох словах патлумачыць, пра што пойдзе размова. Мем у яго інтэрнэтаўскім разуменні — гэта карцінка (хоць часам бывае і відэа, і gif-анімацыя), у якой пры дапамозе ўстойлівага сімвала высмейваецца нейкая з'ява ці персона. Скажам, ёсць знакаміты кадр з фільма «Мсціўцы», на якім акцёр Роберт Даўні-малодшы выразна закатвае вочы. Да выявы дадаецца тэкст, які пачынаецца са слоў «Мой твар, калі...», а далей усё залежыць ад фантазіі аўтара. «Мой твар, калі дзяўчына сцвярджае, што ёй на зборы трэба яшчэ пяць хвілін», «Мой твар, калі маці просіць прыбрацца ў пакоі», «Мой твар, калі выкладчык кажа: «На пераздачу». Варыянтаў можа быць тысячы, асабліва добра такія жарты ствараюцца на падставе нейкіх лакальных сітуацый: у кампаніях сяброў, ва ўніверсітэцкіх групах.

Дарэчы, мемамі становяцца не толькі сусветна знаёмыя асобы. На постсавецкай прасторы ў іх лік увайшлі, напрыклад, акцёр Сяргей Селін з анёльскай усмешкай (ён сыграў Дукаліса ў расійскім серыяле «Вуліцы разбітых ліхтароў»), сумны тэлевядучы Леанід Якубовіч, коснаязыкі мэр Кіева Віталь Кличко і многія іншыя. Ёсць і беларускія вобразы, напрыклад усмешка спевака Аляксандра Саладухі.

Чаму ж да мемаў склалася такое неадназначнае стаўленне? Лічыцца, што такія жарты прыдумляць прасцей за ўсё. Маўляў, бярэш гатовы вобраз і параўноўваеш яго з кім ці чым заўгодна — хутчэй за ўсё, атрымаецца смешна. Па-другое, кажуць, што «спажыванне» такога гумару развівае шаблоннае мысленне — чалавек перастае фантазіраваць сам і ўспрымае жарты толькі праз прызму ўжо існуючых сімвалаў.

Вядома, ёсць і супрацьлеглае, але не вельмі папулярнае меркаванне, што мемы развіваюць памяць (сапраўды, утрымліваць у галаве вялікую колькасць вобразаў, звычайна звязаных з мастацтвам і іншымі сферамі, не так проста), творчыя здольнасці і ўменне лаканічна выказвацца. Акрамя таго, успамінаюць і аб прамой функцыі сатыры — так інтэрнэт-супольнасць не без дапамогі мемаў за апошні час стварыла вельмі негатыўныя вобразы таннага алкаголю, спайсаў, фаст-фуду і іншага. На тэндэнцыю звярнулі ўвагу нават навукоўцы. Некаторыя высновы іх даследаванняў гучаць вельмі цікава. Скажам, як вам сцвярджэнне, што сумесны прагляд мемаў у інтэрнэце працягвае даўжыню стасункаў мужчын і жанчын?

Значнасць з'явы пацвярджае і той факт, што ўзніклі як рэсурсы, прысвечаныя выключна мемам, так і «гібрыдныя» сайты, і публічныя старонкі ў сацсетках. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца, напрыклад, паблікі, у якіх апошнія навіны абыгрываюцца пры дапамозе такіх вось карцінак. З'явілася і фактычна новая прафесія. Пікчар — чалавек, які займаецца стварэннем візуальнага гумарыстычнага і сатырычнага кантэнту, у тым ліку і мемаў. Дарэчы, адзін з самых папулярных на постсавецкай прасторы пікчараў Анатоль Чылік — з Мінска. Хлопец стварае карцінкі для супольнасцяў з сотнямі тысяч падпісчыкаў.

Нават у глабальным сэнсе гумар мемаў выдатна кладзецца ў канцэпцыю культуры постмадэрнізму, калі аўтар адсылае гледача да ўжо існуючых вобразаў і сюжэтаў.

Нядаўна са знаёмымі абмяркоўвалі сучасныя карыкатуры. Сышліся на думцы, што калінікалі сустракаюцца больш ці менш вясёлыя, але збольшага, здаецца, гэта мастацтва сваё аджыло. Час дыктуе новыя ўмовы, у тым ліку і ў плане гумару. Тое, што здавалася бясконца смешным паўстагоддзя таму, сёння можа выклікаць не больш, чым простую ўсмешку. Мяркую, што гэта не дрэнна і не добра, а заканамерна. Нязменным з часоў Старажытнага Рыма застаецца толькі тое, што смехам бічуюць норавы, а ці не ў гэтым яго галоўная функцыя?

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Заўжды гатовы!

СУСТРАКАЙ — «ЦІМУРАЎЦЫ.BY»

Дзень піянерыі і 75-годдзе цімураўскага руху пераемнікі традыцый адзначаць вялікім злётам — пра гэта паведаміла «Чырвонцы. Чырвонай змене» старшыня Цэнтральнага савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Вікторыя МЯНАНАВА. Удзел у III Рэспубліканскім злёце пад назвай «Цімураўцы.by», які пройдзе ў сталіцы 20—22 мая, возьмуць фіналісты аглядуконкурсу піянерскіх агітбрыгад «Запалі агонь дабра!» і іншыя актывісты — усяго больш за 250 чалавек. Удзельнікі змогуць абмяняцца досведам, а таксама сплануюць дзейнасць руху ў краіне на бліжэйшыя тры гады.

Падчас злёту пройдуць урачыстая лінейка «75 цімураўскіх зорак» на Плошчы Перамогі, чарговы агляд-конкурс атрадаў «Запалі агонь дабра!», гісторыка-патрыятычны квэст «Цімураўцы.by» ў гістарычным цэнтры Мінска (для яго праходжання трэба будзе рашаць галаваломкі, лагічныя задачы, загадкі, умець працаваць у калектыве і, канешне, ведаць твор Аркадзя Гайдара «Цімур і яго каманда»), гала-канцэрт з удзелам зорак беларускай эстрады, а таксама канферэнцыя «Цімураўцы сёння: нясём радасць людзям!». Падчас апошняй удзельнікі абмяркуюць праблемы сучаснага руху, падзеляцца сваім бачаннем яго будучыні і ўнясуць прапановы ў выніковы дакумент форуму.

Дарэчы, мінулы год быў для арганізацыі юбілейным. За 25 гадоў БРПА стала самым масавым дзіцячым аб'яднаннем на постсавецкай прасторы. Цяпер у краіне дзейнічае каля трох тысяч піянерскіх дружын, удзел у якіх бяруць больш як 600 тысяч школьнікаў ва ўзросце ад 7 да 18 гадоў. У юбілейны год піянеры прынялі ўдзел у шэрагу акцый, асабліва месца сярод якіх займалі мерапрыемствы, прысвечаныя 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: усебеларускім праекце «Ліст Пераможцу», прысвечанай Дню юнага героя-антыфашыста акцыі «Успомнім усіх пайменна», праекце сацыяльных ролікаў «Праўнукі Вялікай Перамогі», руху шэфства над 15 тысячамі ўдзельнікаў вайны «Ветэран жыве побач», мерапрыемствах па доглядзе за помнікамі і мемарыяламі «Абеліск» і шэрагу іншых.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Фота Надзеі БУЖАН.

Мы памятаем!

ПА-РАНЕЙШАМУ Ў СТРАІ

Вось ужо некалькі гадоў 9 мая па вуліцах розных гарадоў крочыць «Бессмяротны полк». Сёлета ў акцыі прынялі ўдзел больш за сорак краін. Упершыню патрыятычная акцыя пад назвай «Беларусь памятае» прайшла і ў Маладзечне.

...Унутры калоны была нейкая незвычайная атмасфера. Сэрца замірала пры кожным кроку. Здавалася, героі вайны, чые фотаздымкі мы неслі ў руках, ідуць побач з намі. У «Бессмяротным палку» разам са мной «крочыла» мая прабабуля Яўгенія Кірылаўна Комлева. Усю вайну яна — старшына медыцынскай службы — выконвала свой абавязак, дапамагала параненым і выратавала мноства жыццяў. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Будапешта», «За перамогу над Германіяй».

— Я вельмі ганаруся сваім прадзядулем. Калі яго полк трапіў у акружэнне, Аляксей Іванавіч Жыхараў, паранены, вынес дакументы і сцяг палка, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Канец вайны ён сустрэў у Берліне. Разам з іншымі салдатамі мой прадзед пакінуў на сценах рэйхстага надпіс у памяць аб гэтай вялікай падзеі. А калі ў Трэптаў-парку ўстанаўлівалі манумент «Воін-вызваліцель», ён камандаваў узводам аўтаматчыкаў, якія давалі ўрачысты салют, — расказала ўдзельніца акцыі Валерыя Гмыза. — Лічу, што «Бессмяротны полк» — гэта чарговая нагода ўспомніць сваіх блізкіх і наогул усіх тых, хто адвяваў для нас мірнае неба.

Ірына БУБНОВА, вучаніца 9 класа СШ №12 г. Маладзечна.
Фота аўтара.

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

Марафон стартаваў з дапамогі Славу

У Івацэвічах прайшоў дабрачынны марафон БРСМ «Усе фарбы жыцця для цябе».

Напярэдадні міжнароднага Дня сям'і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт рэспубліканскаму дабрачыннаму марафону. Першай эстафету дабрыні прыняла моладзь Брэсцкай вобласці. У Івацэвіцкім раённым доме культуры адбыўся дабрачынны канцэрт з удзелам папулярных беларускіх артыстаў і вядомых творчых калектываў рэгіёна ў падтрымку чатырохгадовага Славы Студзенічкіна з аграгарадка Быцень, якому патрабуюцца аперацыі па перасадцы лёгкіх і сэрца. Усе сродкі, сабраныя валанцёрамі руху БРСМ «Добрае сэрца» падчас творчай дабрачыннай праграмы, будуць накіраваны на лячэнне маленькага Славы.

Мерапрыемствы дабрачыннага рэспубліканскага марафону, «Усе фарбы жыцця для цябе» традыцыйна пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны: 4 чэрвеня ў Мінску марафон будзе прымеркаваны да Міжнароднага дня абароны дзяцей, 12 жніўня ў Магілёве — да Міжнароднага дня моладзі, 21 верасня ў Віцебску — да Міжнароднага дня міру, 7 кастрычніка ў Гродне — да Міжнароднага дня ўсмешкі, 10 лістапада ў Гомелі — да Сусветнага дня моладзі, 9 снежня ў Мінскай вобласці — да агульнарэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці». У мінулы Год моладзі падчас дабрачынных марафонаў «Усе фарбы жыцця для цябе» валанцёры сабралі і пераслалі ў якасці адраснай дапамогі тым, хто меў у ёй патрэбу, больш як 185 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Моцная падтрымка

МАМА «ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І»

Галоўнае заданне падчас экалагічнага фестывалю «Вясёлка над хатаю», які праходзіць у нашай школе, — зрабіць з падручнага матэрыялу прыгожую сукенку ці казачны касцюм і абараніць яго. На сцэне — вучаніца 2 класа Аляксандра Волкава. Сапраўдная Пэпі-ДоўгаяПанчоха! Валасы рыжанькія, рабацінкі на тварыку. А ўсмешка... на мільён! З'явілася на сцэне незвычайна — выкацілася, як кола, пачала «хуліганіць», дэманструючы прыгожую яркую лімонна-зялёную сукенку, зробленую з пакетаў, абрэзкаў паперы і кавалачкаў упаковак букетаў. Пэпі бадзёра станцавала, праспявала песню пра сябе і ўселася на шпагат. І... вось яно, жаданае першае месца! Падыходжу да дзяўчынкі, каб узяць інтэрв'ю.

Яна сядзіць побач з жанчынай, такой жа ярка-рыжанькай. Абедзьве смяшлівыя, з іскрынкамі ў вачах. Такія падобныя адна на адну. Першае пытанне пра вобраз Пэпі. «Хто прыдумаў, чыя ідэя?» «Задумка Алены Іванаўны», — адказала Саша і паказала на маму. «Яна ў нас такая выдумшчыца! І сукенку дапамагла мне зрабіць, і песеньку сама прыдумала, і музыку спампавала з інтэрнэту, і нават смачна мяне накарміла. Мы рыхтаваліся да фестывалю ад самай раніцы і амаль да вечара. Алена Іванаўна і дадому мяне давяла. Яна такая добрая і чулая — усім дзецям дапамагае: каму — задачу рашыць, каму — памірыцца з сябрам, каму

дасць параду, як утаймаваць непаслухмянага сабачку...»

Падчас хуткай гаворкі маленькай весялушкі Сашы я шмат чаго не зразумела. Чаму дачка называе маці поўным імем, дзе яны займаліся, што давялося малую да дому праводзіць, чаму «наша Алена Іванаўна» і якім яшчэ дзецям яна дапамагае? У адказ на першае пытанне чую: «А як інакш?» На другое: «Займаліся дома ў Алены Іванаўны». Зноў нічога не разумею. Пытаюся далей: жывяце не разам? Зноў у адказ: «Не, не! З нашай матулькай Аленай Іванаўнай мы жывём разам — вельмі-вельмі зладжана і сардэчна. Усе справы пасля ўрокаў робім пад музыку, бо Алена Іванаўна любіць танцаваць і нас вучыць, як прыгожа рухацца». «Твая маці яшчэ і танцуе?» — здзіўлена гляджу на Алену Іванаўну, шукаючы падтрымку, каб яна дапамагла мне разабрацца. Вочы маладой жанчыны хітра ўсміхаліся: «Так, Саша правільна ўсё расказала. Я — «шматдзетная маці». У мяне 25 добрых, чулых, адказных дзетак. Сваёй сям'ёй мы ганарымся. Без узаемаразумення, сяброўскай падтрымкі не ўяўляем нашай сумеснай работы, нашых пазакласных спраў. Мы — гэта наш 2 «Б» клас!» — нарэшце Алена Іванаўна расставіла ўсе кропкі над «і». Ад здзіўлення я толькі і змагла спытаць: «Дык вы не маці Сашы, вы — настаўніца?.. Але ж вы такія падобныя!..» Яны абедзве залівіста рассмяяліся і абняліся. А да іх ужо спяшаліся дзеці і дарослыя, каб павіншаваць з першым месцам.

Як добра, калі ў цябе такая моцная падтрымка: твае сябры, твой настаўнік, твае бацькі і бацькі тваіх сяброў! Я назірала за імі здалёк, і было зразумела: сапраўды, гэтыя людзі — вялікая дружная сям'я. Калі ўсё рабіць разам, дык справы будуць выкананы на выдатна!

Аляксандра ПАЎЛЫК,
вучаніца 7 класа СШ №9 г. Мазыра.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
19 05 2016 г.

«АБРЫЎ» З-ПАД КУПАЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)

У цыркавой студыі дзяўчына правяла ўсё дзяцінства. Былі і пэўныя поспехі: удзел у фестывалях, конкурсах, паездкі па блізкім і далёкім замежжы, шматлікія дыпломы... Тым не менш Алена прызнаецца, што звязваць жыццё з цыркам ніколі не збіралася, старанна вучылася ў школе і нават атрымала залаты медаль. Пасля яе заканчэння паступіла на хімічны факультэт БДУ і пераехала ў сталіцу.

— На першым курсе я думала, што з цыркам трэба заканчваць, знайсці сур'ёзную працу і зарабляць грошы, — гаворыць паветраная гімнастка. — Пасядзела месяц дома і зразумела, што гэта ўжо неад'емная частка майго жыцця. Прыйшла ў Белдзяржцырк, прынесла ўсе свае дзіцячыя дыпломы, паказала нумар, і мяне ўзялі. У прынцыпе, тут і сваіх паветраных гімнастаў хапае, а вось у жанры антыпода ніхто не працуе, гэта выміраючы від цыркавога мастацтва. Можа, таму мне і пашанцавала. Цяпер я вучуся на трэцім курсе ўніверсітэта (тут працую на палову стаўкі), але дакладна магу сказаць, што мая будучыня звязана толькі з кар'ерай артыста. Хімію мазгамі я разумею, умею яе прымяняць, але не адчуваю ад гэтага задавальнення.

Дзяўчына лічыць, што найлепшым шляхам да цыркавой будучыні з'яўляюцца студыі, падобныя да той, дзе займалася яна сама. У такіх установах дзецям даюць папрацаваць ва ўсіх жанрах, і яны самі могуць выбраць тое, што ім больш даспадобы. У «дарослым» цырку такой магчымасці няма. Другім распаўсюджаным шляхам у такую незвычайную прафесію з'яўляюцца цыркавыя дынастыі, калі бацькі з ранняга ўзросту развіваюць у дзецях майстэрства, перадаюць ім уласны досвед, а потым працэс паўтараецца... У Беларусі гэта, напрыклад, Бандарчукі, у Расіі — Запашныя... Акрамя таго, існуюць эстрадна-цыркавыя вучылішчы. Праўда, у Беларусі такіх устаноў няма. Найбліжэйшыя знаходзяцца ў Маскве і Кіеве. Але гатоваму артысту такая адукацыя, па словах Алены, непатрэбная — вельмі многае ў прафесіі вырашае самаадукацыя і здольнасць да творчасці.

Тым часам мы пераходзім у другую залу. Тут знаходзіцца яшчэ адна арэна, але крэслаў гледачоў няма — гэта памяшканне прызначана выключна для рэпетыцый. Алена будзе адточваць майстэрства паветранай гімнастыкі на палотнах. Усё робіцца без страхоўкі — па словах дзяўчыны, у гэтай справе яна толькі замінае, бо ў ёй лёгка заблытацца. Але ў голасе ніякага страху не чуваць.

— Я зусім не баюся, — кажа яна. — На вышыні атрымліваю асалоду ад усяго: ад рухаў, адчуванняў. Ты падоўгу абкручваеш рукі тканінай, канцэнтруешся, потым робіш «абрыў» і па-сапраўднаму ляціш — гэта не перадаць словамі. Нехта адчувае «матылькоў у жываце» ад кахання, а я — ад такога падзення. Вядома, здараліся розныя небяспечныя рэчы — нядаўна сарвалася і павісла, зачапіўшыся нагой. Але гэта бывае рэдка, я імкнуся сябе кантраляваць.

Такія рэпетыцыі ў дзяўчыны штодзень. Адзін занятак павінен займаць не менш за гадзіну, але гімнастка звычайна праводзіць тут нашмат больш часу — адточвае кожны элемент. Трэніровак няма толькі ў дні выступленняў. Падчас цыркавога сезона выступаць даводзіцца па некалькі разоў на тыдзень, а па святах — нават і на дзень. Яшчэ здараюцца гастролі, праўда, Алена ў іх не ўдзельнічае з-за вучобы. На летні перыяд артысты або з'язджаюць адпачываць, або шукаюць падпрацоўку.

— Да якога ўзросту можна працаваць? Насамрэч, век паветранага гімнаста не самы доўгі, — кажа дзяўчына. — Працуюць да таго часу, пакуль дазваляе арганізм. Звычайна гэта 30-35 гадоў. Далей большасць проста змяняе профіль работы: пераходзіць у дрэсіроўку, акрабатыку, пачынае працаваць з рэквізітам (тым жа антыподам). Можна займацца рэжысурай, бо досвед ужо назапашаны, адкрыць сваю цыркавую студыю. Калі не атрымліваецца, можна завяршыць цыркавую кар'еру, перайсці ў іншую сферу. У маім выпадку гэта можа быць радыехімія. Дарэчы, у 35 гадоў паветраны гімнаст ужо выходзіць на афіцыйную пенсію, таму зусім без грошай ты наўрад ці застанешся.

Фота Надзеі БУЖАН.

Практыкаванне з хусткамі: калі перастаць круціць «снарады», уся прыгажосць імгненна знікне.

На вышыні 20 з лішнім метраў Алена адчувае сябе ці не лепш, чым на зямлі.

«На вышыні атрымліваю асалоду ад усяго: ад рухаў, адчуванняў. Ты падоўгу абкручваеш рукі тканінай, канцэнтруешся, потым робіш «абрыў» і па-сапраўднаму ляціш — гэта не перадаць словамі».

Ёсць у маладой гімнасткі і цэлы шэраг прафесійных узнагарод. Спецыяльна для цыркавых артыстаў у многіх краінах праводзяцца фестывалі, на якіх можна прадэманстраваць сваё майстэрства. Сярод апошніх дасягненняў Алены сярэбраны медаль маладзёжных Дэльфійскіх гульняў у расійскім Арле, другое месца на Рыжскім фестывалі, першае — на карпаратыўным фестывалі «Факел» у Расіі, фестывалі «Кветкі Расіі» ў Санкт-Пецярбургу і многіх іншых.

— Не магу сказаць, што ў цырку ў мяне шмат сяброў, — прызнаецца дзяўчына. — Калектыў выдатны, з усімі падтрымліваю добрыя адносіны, але сапраўдныя сябры ў мяне ва ўніверсітэце. Ім, дарэчы, вельмі падабаецца тое, чым я займаюся. Некалькі разоў нават прыходзілі на выступленні, не верылі вачам... У інтэрнаце могуць папрасіць мяне нешта падаць, бо ведаюць, што я магу зрабіць гэта нагой *(смяецца)*.

Наконт будучыні Алена пакуль не загадвае. Пасля навучання на хімфаку яе чакае размеркаванне, але дзяўчына хоча застацца ў цырку.

— Я не лічу сваю працу складанай, — кажа яна. — Самае цяжкае — прымусіць сваё цела працаваць так, як табе трэба, бо яго магчымасці абмежаваны прыродай. Люблю сваю працу за тое, што яна неаднастайная. Здавалася б — штодзень рэпетуеш адны і тыя рухі, «праганяеш» аднолькавую праграму. Але заўсёды ёсць магчымасць дадаваць новыя элементы, змяняць іх парадак, прыдумляць цікавыя пераходы, карыстацца новым рэквізітам... У гэтым і заключаецца творчасць. Таму сумна ў цырку не бывае.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Матывацыя

НАВОШТА ДЗІЦЯЦІ ЖАЛЕЗА,

ці Чаму беларускае — лепшае

Як выбраць найлепшае дзіцячае харчаванне? Гэтым пытаннем задалася вучаніца 11 класа сталічнай гімназіі №7 Лізавета СТАРАЖЭНКА. Яна разам са сваім навуковым кіраўніком Людмілай Голад правяла шэраг даследаванняў і выявіла найбольш якасныя ўзоры прадуктаў, прызначаныя для харчавання дзяцей. За што і была ўзнагароджана дыпломам на гарадскім этапе навукова-практычнай канферэнцыі па хіміі.

Дзяўчына прааналізавала хімічны састаў сокаў і пюрэ з садавіны і гародніны: эксперыментальна вызначыла вітамінна-мінеральнае «напаўненне» беларускіх і імпартных узораў. І ў выніку даведалася, якія з іх найлепшыя.

— Асабістай прычынай выбару гэтай тэмы стала тое, што я, як будучы доктар, клапачуся пра здароўе дзяцей, — гаворыць Лізавета. Яна ўжо не першы год удзельнічае ў алімпіядах не толькі па хіміі, але і па біялогіі. Цвёрда вырашыла, што будзе паступаць у медыцынскую ВНУ.

— Мы аналізавалі ўтрыманне жалеза і бэта-караціну як адных з найважнейшых мікраэлементаў для дзіцяці. Жалеза забяспечвае работу імуннай сістэмы, а яго дэфіцыт можа прывесці да захворванняў органаў дыхання і страваванння. Па сваёй біялагічнай каштоўнасці жалеза можна параўнаць з хларафілам для раслін — настолькі яно неабходна чалавеку. А бэта-карацін — магутны антыаксідант. Ён таксама валодае імунастымулюючым дзеяннем. Многія ведаюць, што гэтыя мікраэлементы ўтрымліваюцца ў яблыках і моркве. Але, насамрэч, яны ёсць амаль ва ўсіх прадуктах. Напрыклад, у шпінаце, арэхах, рыбе. Праўда, пасля перапрацоўкі ў дзіцячым харчаванні іх застаецца няшмат, таму і трэба звяртаць асаблівую ўвагу на састаў прадуктаў.

Кіраўнік навуковай работы Людміла Голад не першы год займаецца навуковымі даследаваннямі з вучнямі. Сёлета адразу некалькі яе выхаванцаў сталі ўдзельнікамі рэспубліканскай алімпіяды па хіміі. Настаўніца расказала, чым цяпер цікавяцца гімназісты:

— Дзеці ў нас вельмі матываваныя. Сямікласнікі, напрыклад, з задавальненнем вырошчваюць дома крышталі. Многія дзевяцікласнікі плануюць паступаць у Ліцэй БДУ, таму яны ўжо не толькі эксперыментуюць, але і рашаюць больш сур'ёзныя задачы. А са старшакласнікамі я ўжо даўно займаюся менавіта вывучэннем тых рэчываў, якія ўтрымліваюцца ў прадуктах харчавання. Сёння мы часам не ведаем, што ядзім і п'ём. Летась была вельмі цікавая тэма, з якой мы выйшлі на рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю. Ёсць такое атрутнае рэчыва — оксіметылфурфурол, — якое ўтвараецца ў мёдзе, калі яго няправільна захоўваюць ці дадаюць у прадукт тое, чаго ў ім быць не павінна. У выніку даследавання былі знойдзены няякасныя ўзоры. Гэта тычыцца, найперш, прадукта, які быццам бы паступае з Башкірыі. Вядома, калі гэта натуральны башкірскі мёд, то ён будзе адпавядаць устаноўленым стандартам. Але часам пад гэтай маркай на рынку хаваюцца і няякасныя прадукты.

Вынікі даследавання Лізаветы паказалі, што ў беларускіх прадуктах, прызначаных для дзіцячага харчавання, колькасць карысных мікраэлементаў большая, чым у іх замежных аналагах. Дзяўчына плануе працягнуць сваю навуковую работу. Наступным крокам будзе аналіз утрымання калію і натрыю ў гэтых прадуктах.

Надзея АНІСОВІЧ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

УВАГА, АЎТАРЫ!

Згодна з умовамі нашага творчага спаборніцтва, прыём «проб пяра» ад ахвотных у ім паўдзельнічаць быў скончаны ў пачатку месяца. За час правядзення чарговага конкурсу сярод юных і маладых няштатных аўтараў мы атрымалі некалькі дзясяткаў работ, прычым, як заўсёды, добрая іх частка паступіла літаральна ў самы апошні момант. Каб іх усе прачытаць і падрыхтаваць да друку лепшыя, патрэбны час. Таму публікацыя работ працягваецца! Нагадваем, вынікі творчага спаборніцтва плануецца падвесці да пачатку ўступнай кампаніі (не называючы пакуль даты), каб старэйшыя яго ўдзельнікі — выпускнікі гэтага года, што будуць сёлета «штурмаваць» журфак, — у выпадку перамогі змаглі апроч публікацый у партфоліа і ганаровых грамат атрымаць яшчэ і рэкамендацыі для паступлення. Што тычыцца кароткага аналізу «проб пяра», якія паступілі ў рэдакцыю, дык сярод іх ёсць як напісаныя сапраўды па-журналісцку, так і, на жаль, такія, якія не адпавядаюць умовам конкурсу, найперш у плане творчага складніка. Хто ж будзе прызнаны лепшым? Інтрыга захоўваецца! Мы ж прапануем ахвотным у чаканні падвядзення вынікаў дасылаць нам свае творчыя работы ўжо па-за конкурсам.

«СОНЕЧНАЯ МУЗЫКА»,

або Ад «Ветру ў галаве» да «Новай хвалі»

Саша Захарык — адна з фіналістак беларускага адбору на «Еўрабачанне-2016». Да сваёй песні яна сама напісала музыку. Трэк называецца Glory Night («Ноч ззяння»). Спявачка нарадзілася ў Мінску. З шасці гадоў захапляецца музыкай. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна. У 12 гадоў пачала прафесійна займацца вакалам. Сваю першую песню напісала ў 14 гадоў. У 2009 годзе брала ўдзел у фінале песеннага конкурсу «ЕўраФэст» у складзе групы «Вецер у галаве». А сёлета плануе выступіць на конкурсе «Новая хваля» ў Сочы ад нашай краіны.

— Аляксандра, як з'явілася рашэнне падаць заяўку на адбор «Еўрабачання»?

— Насамрэч я не планавала ісці на конкурс, але раніцай у апошні дзень падачы заяў мой малады чалавек сказаў, што ў мяне ёсць нядрэнная песня, абяцаў дапамагчы з фанаграмай (ён аранжыроўшчык, мультыінструменталіст). За дзве гадзіны ўсё было гатова, і за дзесяць хвілін да закрыцця пошты мы літаральна пабеглі адпраўляць работу. Праз пару дзён мне патэлефанавалі і сказалі, што я прайшла на адбор. Я была перадапошняя (усяго паступіла каля 100 заяў) і ўвечары таго ж дня даведалася, што прайшла ў дзясятку.

— У чым адметнасць тваёй выканальніцкай манеры?

— Мае слухачы і сябры гавораць, што мой стыль можна апісаць словамі «сонечная», «добрая», «пазітыўная» музыка. Пакуль што мне падабаецца развівацца ў гэтым кірунку, але не выключана, што праз пару гадоў будзе падабацца зусім іншы настрой падачы песень. Зусім нядаўна, напрыклад, я напісала кампазіцыю для беларускай кароткаметражкі «Называйте гэта, як хочаце», і яна вельмі адрозніваецца ад майго асноўнага рэпертуару, таму што сумная.

«Папулярнасць мяне яшчэ не вельмі хвалюе, больш хачу быць пазнавальнай праз свае песні. Але гэта пакуль не асноўная мэта, лічу, што знаходжуся ў творчым пошуку».

— Раскажы пра свой шлях творчага станаўлення як спявачкі.

— Безумоўна, была музычная школа. Сем гадоў па класе фартэпіяна. А праз тры гады, калі быў аб'яўлены адбор на дзіцячае «Еўрабачанне», напісала сваю першую песню. Лічу, што гэта быў вельмі важны этап у маім жыцці, таму што музычнае выхаванне для кожнага артыста — абавязковая рэч. І калі б мая маці ў свой час спынілася і апусціла рукі, то я магла б і не мець такога вопыту.

Таксама былі розныя эстрадныя студыі. У 11 гадоў пайшла ў музычны ансамбль «Рэвю» Наталлі Раманавай. З яго і пачаўся мой творчы шлях як вакалісткі. Затым Ліцэй БДУ. У прынцыпе я паступіла туды з-за таго, што там вялікая сцэна, добры гук і магчымасці для самавыяўлення. Але тады я не ведала, што звяжу сваё жыццё з музыкай, меркавала пайсці або на журфак, або на філфак. А за месяц да паступлення мама мне сказала, каб я лепш пайшла ў артысткі. Ну, я і паступіла ва ўніверсітэт культуры. Потым былі новыя знаёмствы, канцэрты... Я бясконца шчаслівая і магу дзякаваць Богу за магчымасць займацца тым, што люблю.

Зараз спяваю ў кавер-бэндзе «Яблычны чай» (AppleTea), мы запісваем уласныя песні і праводзім карпаратыўныя праграмы. Выконваю пераважна джазавыя песні, таму мяне называюць джазавай спявачкай, але я з гэтым не згодна. Я поп-спявачка. Хутка мы паедзем на джазавы фестываль. Вось там я змагу апраўдаць сваё званне *(усміхаецца)*. Але мне яшчэ трэба грунтоўна падрыхтавацца са сваім бэндам.

— Ты лічыш сябе папулярнай?

— Не лічу. Для мяне вельмі важна, як і для любога артыста, які піша сам, каб песні былі пачуты, а кола слухачоў пашыралася. У любым выпадку папулярнасць мяне яшчэ не вельмі хвалюе, больш хачу быць пазнавальнай праз свае песні. Але гэта пакуль не асноўная мэта, лічу, што знаходжуся ў творчым пошуку.

— Што ўплывае на фарміраванне твайго светапогляду?

— Безумоўна, кнігі, фільмы, але вандроўкі — найбольш моцная крыніца. Гэта бясконцае натхненне, таму што адкрываеш нешта новае. Ну, і, канешне, музыка. Вельмі люблю слухаць і глядзець відэа з канцэртаў маіх любімых артыстаў: Beyonce, Stevie Wonder, Franklin. Дарэчы, у ліпені я еду ў Амстэрдам на канцэрт Beyonce. Я не магу паверыць: калі набывала квіткі, то плакала ад шчасця.

— Хто твой кумір?

— Beyonce, напрыклад, мяне вельмі натхняе як спявачка і жанчына, як танцор, рэжысёр, прадзюсар. Таксама Alicia Keys, Justin Timberlake, Jamiroquai...

— Якія дасягненні лічыш галоўнымі на творчым шляху?

— Ну, па-першае, тое, што я пачала сама пісаць песні. Па-другое, Ліцэй БДУ і ўніверсітэт культуры — гэта каштоўны вопыт выступленняў і новыя сябры, якіх я таксама лічу сваім дасягненнем. Канешне, «Яблычны чай». Спяваць з імі было маёй марай. Таксама мой малады чалавек — яшчэ адно дасягненне *(усміхаецца)*. Яго калектыў, работа з ім — найкаштоўнейшы вопыт для мяне. Я вельмі рада, што працую ў гэтым аркестры. Конкурсы і фестывалі не лічу дасягненнямі. Гэта толькі крокі на шляху самаразвіцця.

— А як ты ставішся да творчых эксперыментаў?

— З задавальненнем. Было ўжо некалькі праектаў з рэперам Вінсентам. Таксама рэгулярна ёсць прапановы ад беларускіх дыджэяў, якія жадаюць запісаць разам песню. Я мяркую, што ў хуткім часе будзе што-небудзь цікавае.

— Ці хапае часу на асабістае жыццё?

— Так атрымалася, што мой малады чалавек — музыкант. Лічу, што нам пашанцавала, бо і мэты ў нас аднолькавыя, і працуем разам.

— Што для цябе галоўнае на гэтым этапе жыцця?

— Імкненне да самарэалізацыі. Трэба многа працаваць, каб ганарыцца сабой. Творчы чалавек заўсёды поўны ідэй і планаў. Але ёсць праблемы з лянотай, я пастаянна з ёй змагаюся...

Валерыя КАМКОВА,
вучаніца 10 класа Ліцэя БДУ.

ПРА АЎТАРА

Валерыя, па яе словах, шмат чытае, любіць спорт і актыўны лад жыцця.

— З дзяцінства займаюся каратэ ў клубе. Таксама захапляюся блогамі і спрабую сама здымаць відэа і весці свае старонкі ў сацыяльных сетках, — гаворыць 15-гадовая аўтарка. — Люблю стасункаваць з крэатыўнымі і пазітыўнымі людзьмі: яны дораць мне наймацнейшае натхненне. Аб прафесіі думаю так: праца павінна быць у задавальненне. Я планую паступаць у Інстытут журналістыкі, мяркую, у гэтай прафесіі маё месца. А цяпер стараюся развівацца па ўсіх кірунках.

СВАЯ «ДАРОЖКА» ДА АЛІМПІЙСКАГА ЗОЛАТА

«Я веру, я змагу, я вытрымаю!» — паўтараў унутраны голас. Спартсмен займае сваё месца ў каноэ. Збіраецца з думкамі. Секунда і... старт! Паскараецца, што ёсць моцы. Сапернікі не адстаюць. Хутка вырашыцца тое, да чаго так доўга імкнуўся. Сэрца падказвае: поспех — блізка! Глыбокі ўдых, апошні рывок, выдых. Фініш! Ён — пераможца!

Сучасная моладзь мае невычарпальную колькасць магчымасцяў для самарэалізацыі. Нехта знаходзіць сябе ў творчасці, для кагосьці навука найцікавейшая за ўсе іншыя заняткі, а чыясьці мара — адчуць смак перамогі на спартыўных спаборніцтвах.

У 2013 годзе мара аднаго з маладых і перспектыўных спартсменаў Гродзеншчыны здзейснілася. Ён — Дзмітрый Лапата — першы раз стаў пераможцам чэмпіянату Беларусі сярод мужчын па веславанні на каноэ. Гісторыя паўтараецца ў 2014 і 2015 гадах, калі Дзмітрый зноў паказвае выдатны вынік не толькі на чэмпіянаце краіны, але і на еўрапейскіх спаборніцтвах у Францыі (сярод юніёраў да 19 гадоў) і Румыніі (сярод моладзі да 23 гадоў), дзе заваёўвае «серабро».

Дасягненні гэтага маладога і энергічнага спартсмена з'яўляюцца вынікам плённай шматгадовай працы. Дарэчы, у спорт Дзмітрый прыйшоў у васьмігадовым узросце і ўжо пасля трэціх заняткаў пачаў трэніравацца са старэйшымі наведвальнікамі секцыі. «Мне заўсёды падабалася і падабаецца трэніравацца з тымі, хто больш моцны і вопытны за мяне, — кажа мой суразмоўца, — бо ў іх я вучуся нечаму новаму».

Будні спартсменаў вызначаюцца асаблівым рытмам жыцця. Амаль заўсёды Дзмітрый знаходзіцца на зборах, практычна не бываючы дома. І падчас нашай размовы ў «Скайпе» ён таксама быў далёка ад радзімы — на зборах у Партугаліі. Хлопец адзначае: «Гэта вельмі цікава — падарожнічаць, але доўгія пералёты або пераезды парушаюць рэжым сну і адпачынку, што, зразумела, не вельмі добра для спартсмена».

ПРА АЎТАРА

Юля нарадзілася на мілай яе сэрцу Мастоўшчыне, у аграгарадку Дубна. «Вельмі люблю гэты куток за яго бясконца цікавую гісторыю, добразычлівых людзей і прыгожыя пейзажы».

Хутка наша 17-гадовая аўтарка закончыць школу. «Сумна развітацца з ёй — тут я адкрыла ў сабе многія якасці і здольнасці, удзельнічала ў цікавых праектах, конкурсах, алімпіядах, канферэнцыях, была вядучай шматлікіх мерапрыемстваў, — кажа дзяўчына. — Кім хачу стаць, вырашыла яшчэ ў 8 класе. Мая мара — стаць журналістам. Яго праца — гэта новыя знаёмствы, шмат адкрыццяў, а самае галоўнае — творчасць! Лічу, што калі працаваць і верыць у добры вынік, то ўсё абавязкова атрымаецца».

Пасля заканчэння вучылішча алімпійскага рэзерву ў Гродне паўстала пытанне аб будучай прафесіі хлопца, але яго адказ быў адназначны: «Я і спорт — адзінае цэлае». Сёння Дзмітрый Лапата — студэнт ГрДУ імя Янкі Купалы, дзе ён навучаецца на факультэце фізічнай культуры і спорту.

Спартыўныя дасягненні маладога весляра не засталіся незаўважанымі. Летась яго ўключылі ў спіс стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, а з 2016-га ён атрымлівае абласную стыпендыю.

Увогуле, Дзмітрый — вельмі добры чалавек. Размаўляць з ім лёгка і цікава! Спартсмен запэўнівае, што ўсё наша жыццё — гэта неспадзяванкі, і калі мы будзем імкнуцца да сваіх мэт, жаданняў, мар, то гэтыя неспадзяванкі абавязкова будуць толькі прыемнымі! Ён шмат гаворыць аб сваім трэнеры: «Яго падтрымка для мяне вельмі важная. Трэнер — чалавек, які заўсёды побач, якому я ўдзячны за многае». «Ніколі не здавацца!» — словы, якія сталі сапраўдным дэвізам хлопца.

«Спорт падараваў мне мэту і дапамог дабіцца такіх вынікаў, — гаворыць Дзмітрый, — менавіта дзякуючы яму я даведаўся, да чаго трэба імкнуцца, пабываў у такіх краінах, як Францыя, Венгрыя, Румынія, Партугалія, Польшча, Малдова». На маё пытанне аб марах малады чалавек адказаў не раздумваючы: «Мая мара і мэта крочаць заўсёды разам. Напэўна, як і любы спартсмен, я мару аб алімпійскім «золаце». Але напярадзе яшчэ шмат працы, трэніровак і цяжкасцей, якія я павінен пераадолець».

Юлія МАЦІЕЎСКАЯ,
вучаніца 11 класа Дубненскай СШ
Мастоўскага раёна.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

19 05 2016 г.

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:
• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование) • организации и проведению аукционных торгов
• инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 20 июня 2016 г. в 11.00 открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения УП «СВ КЛАСС» (продавец), в составе:

Лот № 1 – кап. строение с инв. номером 710/С-4251 (здание подсобного хозяйства) общ. пл. 1223,0 кв.м; расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 142К.
Лот № 2 – кап. строение с инв. номером 710/С-4252 (здание мебельного производства) общ. пл. 852,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 142А/15
Лот № 3 – кап. строение с инв. номером 710/С-41163 (здание электроцеха) общ. пл. 717,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 142Г
Лот № 4 – кап. строение с инв. номером 710/С-39960 (здание скалада химматериалов) общ. пл.1392,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 142Д
Лот № 5 – кап. строение с инв. номером 710/С-15670 (здание бондарно-сушильного цеха) общ. пл.1922,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Рогачевская 37Б

Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369				
Место проведения торгов и подачи документов	ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала«Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30				
Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**	**Лот № 3**	**Лот № 4**	**Лот № 5**
Начальная цена продажи, рублей без учета НДС	**1 510 100 000**	**1 456 983 000**	**1 985 211 000**	**3 610 200 000**	**3 012 200 000**
Размер задатка, рублей	**10% от начальной цены продажи**				
	151 010 000	**145 698 300**	**198 521 000**	**361 020 000**	**301 220 000**
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 369				
Информация о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 741000000001000304, пл. 0,4575 га. Имущественные права – право постоянного пользования. Правообладатель – УП «СВ Класс»	Земельный участок с кадастровым номером 741000000001000326, пл. 13,9044 га. Имущественные права – право постоянного пользования. Правообладатели – ОАО «Бобруйский кожевенный комбинат» доля в праве 9497/10000, УП «СВ Класс» – 3/100, частное торговое унитарное предприятие «Славянское пиво» – 203/10000	Земельный участок с кадастровым номером 741000000001000325, пл. 0,0589 га. Имущественные права – право постоянного пользования. Правообладатель – УП «СВ Класс»	Земельный участок с кадастровым номером 741000000001000299, пл. 0,2528 га. Имущественные права – право постоянного пользования. Правообладатель – УП «СВ Класс»	Земельный участок с кадастровым номером 741000000009001558 пл. 0,4413 га. Имущественные права – право постоянного пользования. Правообладатель – УП «СВ Класс»
Условия продажи	1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%. 2. Предметы торгов находятся в ипотеке и реализуются с согласия Залогодержателя.				
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов				
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	По 15 июня 2016 г. включительно до 16.00				

Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы: заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус.(рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.
Порядок проведения торгов: шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов, будет зачтен в счет оплаты стоимости услуг Организатора торгов, разница между задатком и суммой стоимости услуг будет зачислена в счет окончательной оплаты приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения.
Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72-01-32, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение
«Минскстрой»
ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ о строительстве нежилых помещений объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану. Встроенные помещения», *опубликованную в газете «Звязда» 29 мая 2015 года:*

Стоимость строительства 1 кв. метра площади административных помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ составляет:
Помещение № 1 — 18 833 400 руб;
Помещение № 2 — 18 578 300 руб;
Помещение № 3 — 18 645 500 руб.
Окончательный расчет стоимости строительства будет производиться после ввода объекта в эксплуатацию по фактическим затратам.
Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию 31 мая 2016 г.
Заявления о долевом строительстве нежилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, кабинет 105, непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.
Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Генеральный директор *Ф.В.Римашевский*

УНП 100071325

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,

опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16
строительство 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт г. Минск:

«…Стоимость 1 кв.м квартир общей площадью **117,17** кв.м на 10 этаже составляет **1000** (одна тысяча) **долларов США** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, оф. 701, тел. 8 (017) 306-20-90 пн-пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00)

УНП 101019973

Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

№ лота	Адрес участка	Кадастровый номер 14010000000	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Срок аренды, лет	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании
1	б-р Космонавтов	1029524	0,0141	строительство и обслуживание (пристроенного) объекта оказания бытовых услуг и торгово-офисного назначения	10	61 877 898	12 370 000	20 273 957	0,0038 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В
2	пр-т Республики (р-н АЗС №85 «Белнефтехим»)	1029525	0,3184	строительство и обслуживание бесконтактной автомобильной мойки	10	262 777 437	52 550 000	24 022 589	ограничений в использовании земель нет
3	ул. Коммерческая, 14	1029509	0,0935	строительство и обслуживание физкультурно-оздоровительного объекта общественного назначения (фитнес-салона)	10	155 005 614	31 000 000	20 429 555	0,0025 га – охранная зона подземной кабельной линии электропередачи напряжением до 1000 В
4	ул. Писателя Смирнова	1029265	1,1839	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	10	755 947 354	151 180 000	51 772 867	1,1839 га – водоохранная зона реки Западный Буг; 0,0510 га – охранная зона линии кабельной линии связи; 0,0576 га – охранная зона газопровода среднего давления
5	ул. Советской Конституции (район прокуратуры Брестской области по ул. Советской Конституции, 6/1)	1019903	0,5909	строительство и обслуживание объекта административно-производственного назначения	10	1 614 488 700	322 890 000	540 000	0,1432 га – санитарно-защитная полоса водоводов; 0,0043 га – охранная зона линии электропередач
6	ул. Дубровской	1029119	0,7224	строительство и обслуживание производственно-складской базы	10	667 672 179	133 530 000	45 392 240	0,0278 га – охранная зона подземной линии связи и радиофикации, 0,0587 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, 0,0105 га – охранная зона сетей и сооружений канализации Дополнительное условие в использовании земельного участка в виде необходимости организовать проезд (сервитут) по территории СООО «Брествнештранс»
7	ул. Чичерина, 10	1029120	0,1688	строительство и обслуживание объекта торговли продовольственной группой товаров	10	429 014 417	85 800 000	33 166 882	0,0670 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, 0,0145 га – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения
8	в районе ул. Гродненской	1029050	0,5113	строительство и обслуживание торгового центра	10	942 205 519	188 440 000	36 124 330	0,0626 га – охранная зона сетей и сооружений канализации 0,1436 га – охранная зона сетей и сооружений водопровода
9	ул. Писателя Смирнова	1029049	0,4000	строительство и обслуживание торгового центра	10	419 405 999	83 880 000	40 524 056	0,0108 га – охранная зона подземной линии связи и радиофикации 0,0030 га – охранная зона сетей и сооружений канализации
10	в районе ул. 5-й Кедровой	1029052	0,2363	строительство и обслуживание магазина со смешанной группой товаров, с мини-кафе	10	202 701 902	40 540 000	36 071 958	0,0367 га – охранная зона линии электропередач напр. до 1000В 0,0509 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения 0,0972 га – охранная зона сетей и сооружений канализации 0,0353 га – охранная зона мелиоративных земель сумма убытков, причиняемых нарушением функционирования мелиоративных и противоэрозионных сооружений на зем. участке в размере 2 075 640 руб., подлежащая компенсации КУП «Брестское ДЭП»
11	на перекрестке ул. Коммерческой и ул. Автолюбителей	1029051	0,4899	строительство и обслуживание объекта торговли	10	793 722 422	158 740 000	45 123 737	0,1163 га – охранная зона сетей и сооружений канализации
12	в районе ул. Луцкой	1029053	0,9615	строительство и обслуживание объекта производственно-складского назначения	10	1 098 662 586	219 730 000	36 273 033	0,0166 га – охранная зона подзем. линии электропередачи напр. до 1000В 0,0339 га – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения
13	ул. Карьерная	1028438	0,2800	строительство и обслуживание объекта производственно-офисного, бытового назначения	10	254 107 071	50 820 000	8 447 772	ограничений в использовании земель нет
14	в районе ул. Ковельской, 85	1027194	0,0096	строительство и обслуживание магазина продовольственной группы товаров	10	14 945 529	2 980 000	450 000	ограничений в использовании земель нет
15	ул. Писателя Смирнова	1028423	1,0909	строительство и обслуживание торгового объекта	10	1 143 825 011	228 760 000	15 206 021	0,0597 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения
16	ул. 2-я Белорусская	1019335	0,8704	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	10	863 042 702	172 600 000	1 450 817	0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления
17	в районе ул. Волгоградская	1025064	0,2967	строительство и обслуживание спортивных сооружений	10	593 865 961	118 770 000	1 306 845	ограничений в использовании земель нет
18	ул. Высоковская	1027693	0,4733	строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями	10	1 187 926 867	237 580 000	5 941 339	ограничений в использовании земель нет
19	ул. М.Л. Мошенского	1025787	0,9446	строительство и обслуживание автостоянки	10	1 680 630 619	336 120 000	1 513 733	0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления
20	ул. Базановой, 4	1026802	0,0187	установка и обслуживание объекта торговли	10	71 884 952	14 370 000	1 407 198	0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0056 га – охранная зона водопровода
21	ул. Красногвардейская	1026816	0,0035	строительство и обслуживание объекта социального назначения №1	10	5 226 408	1 040 000	1 529 617	0,0002 га охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В
22	ул. Красногвардейская	1026817	0,0035	строительство и обслуживание объекта социального назначения №2	10	5 226 408	1 040 000	1 001 905	0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В
23	ул. Красногвардейская	1026818	0,0035	строительство и обслуживание объекта социального назначения №3	10	5 226 408	1 040 000	1 001 905	ограничений в использовании земель нет

Дополнительные условия для победителя аукциона:
по лоту №1: в установленном порядке осуществить устройство шумозащитного ограждения между границами санитарно-защитной зоны цеха №2 по ул. Карбышева, 92 в г. Бресте и жилым домом по ул. Карбышева, 84 в г. Бресте;
по лоту №2: в установленном порядке обеспечить организацию транспортных потоков с возможностью заезда на АЗС и мойку без выезда на разворот на пр-т Республики;
по лоту №3: до осуществления государственной регистрации возникновения права на земельный участок возместить на транзитный расчетный счет, открытый главному управлению Министерства финансов Республики Беларусь по месту постановки на учет предприятия (назначение платежа 05201), потери сельскохозяйственного производства в сумме 14 848 000 рублей, связанные с изъятием 0,0939 га сельскохозяйственных земель для последующего использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства;
по всем лотам: обеспечить содержание приобретенного земельного участка в надлежащем санитарном и техническом состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста).
Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».
Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.
Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.
Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.
Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной, увеличенной на 5%, обязан:
• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;
• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;
• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;
• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).
Аукцион состоится 2 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 19.05.2016 г. до 17.30 27.05.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.
Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by

Камертон настрою

РОДНАЙ МОВАЙ КРАНАЮЧЫ СЭРЦЫ...

Культурнай сталіцай Беларусі сёлета стала Маладзечна. І гэта не выпадкова, бо тут часта праходзяць цікавыя культурныя падзеі: выставы, канцэрты, фестывалі, літаратурныя гасцёўні. Адна з такіх сустрэч адбылася ў Маладзечанскім музычным каледжы імя М.К. Агінскага. Сюды завіталі маладыя беларускія паэты, перакладчыкі, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Аксана Ярашонак і Рагнед Малахоўскі. Госці расказвалі пра сябе, адказвалі на пытанні і, безумоўна, дзяліліся сваёй творчасцю. Трэба сказаць, што маладыя людзі пішуць выключна на беларускай мове...

Аксана Ярашонак і Рагнед Малахоўскі (у цэнтры) з навучэнцамі музычнага каледжа.

«Нам складаць радкі і ноты...»

«Сустрэча з родным горадам — заўсёды свята», — канстатуе мая зямлячка Аксана Ярашонак. Любоў да Маладзечна яна выказала ў вершах, якія з задавальненнем прачытала. Цяпер паэтка жыве ў вёсцы Ілья Вілейскага раёна, працуе ў школе. Непаўторныя вясковыя пейзажы пастаянна натхняюць яе на напісанне вершаў аб прыродзе.

Многае пра жыццё Аксаны я даведалася з яе твораў. У паэткі было вясёлае і бестурботнае дзяцінства. Цяпер яна сумуе па тых часах, калі стасункі паміж людзьмі былі больш жывыя, навіны атрымлівалі з газет, а не з інтэрнэту. «Папяровых пасланняў часам усё ж не хапае», — з сумам адзначае паэтка ў адным з вершаў.

Самым яркім часам у сваім жыцці яна лічыць студэнцкія гады: «Кожны раз, калі я праходжу каля педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, сэрца заходзіцца ад эмоцый». Гэтыя пачуцці таксама знайшлі адлюстраванне ў творчасці.

Цяпер у паэткі дзве дачкі, і кожнай яна прысвяціла верш. Дзякуючы дзяўчынкам Аксана навучылася па-іншаму глядзець на свет. І цяпер замест аблокаў яна бачыць «цукровую вату», а сонейка параўноўвае з «гарачай карамеллю».

Першы і пакуль адзіны зборнік Аксаны Ярашонак называецца «Звычайнае шчасце». Яе творы хутка знайшлі водгук у маёй душы. Яны здаліся мне простымі, але ў той жа час вельмі зразумелымі і блізкімі. Я з задавальненнем буду надалей цікавіцца яе творчасцю.

«Дыяментавым россыпам слоў...»

Другім госцем сустрэчы быў Рагнед Малахоўскі. Гэта не псеўданім, а яго сапраўднае імя. Бацькі чакалі дачку, якую хацелі назваць у гонар полацкай князёўны. Нарадзіўся хлопчык, аднак тата і мама вырашылі не адмаўляцца ад сваёй мары.

Рагнед жыве ў Мінску, але часта бывае ў Маладзечне. Гэты горад навявае яму ўспаміны пра першае каханне. На жаль, яно было неўзаемнае, і, напэўна, таму пад яго ўплывам юнак стаў пісаць вершы. Першае пачуццё і да гэтага часу натхняе паэта на лірыку.

Ён скончыў Нарачанскую сярэднюю школу, паступіў у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, але свой лёс вырашыў звязаць з паэзіяй. Працаваў рэдактарам у часопісах «Полымя», «Маладосць» і «Бярозка». Сёлета выдавецтва выпускае серыю кніг «Маладая паэзія Беларусі» пад яго рэдакцыяй.

— Калі сярод вас ёсць людзі, якія нешта пішуць, але баяцца паказаць, можаце смела звяртацца да мяне, — запрасіў Рагнед.

У самаго паэта ёсць ужо тры зборнікі вершаў. Першы ён назваў «Беражніца», каб яна аберагала яго творчасць. Другая кніга «У дзённай мітусні» прынесла яму Мінскую абласную прэмію ў галіне літаратуры ў намінацыі «Паэзія». У апошні зборнік, які называецца «Жыві», увайшлі самыя любімыя творы аўтара.

З нядаўняга часу Рагнед спрабуе пісаць для дзяцей. Напрыклад, не так даўно ў часопісе «Вясёлка» надрукаваны яго верш «Слон і айфон», які я раю прачытаць усім падлеткам. Вельмі павучальна!

Акрамя паэзіі, Рагнед захапляецца электроннай музыкай і фатаграфіяй. «Я здымаю ў асноўным пейзажы і дзяўчат», — жартуе ён.

Юныя таленты, якія вучацца ў Маладзечанскім музычным каледжы, падрыхтавалі для гасцей падарункі: яны напісалі і выканалі песні на іх вершы. Маладых паэтаў вельмі кранула такая ўвага.

Дар'я СВІРЫДА,
вучаніца 11 класа гімназіі №10 г. Маладзечна.

Свая роля

«ЗАЛАТЫ МЛЫН» ТАЛЕНТАЎ

У нашай гімназіі дзейнічае школьны тэатр «Залаты млын», у якім дзеці знаёмяцца з традыцыямі беларускай культуры. Яго кіраўнік Аксана Жаромская захоплена фальклорам *(на здымку).*

— Усё пачыналася з невялікай групы вучняў. Мы разам вывучалі батлейку — народны лялечны тэатр. Менавіта ён стаў асновай будучага «Залатога млына». Стараліся з дзецьмі даведацца як мага больш пра гісторыю нацыянальных касцюмаў, паступова вучыліся мастацтву «кіравання» лялькай, — прыгадвае педагог. — Першы вопыт тэатра — невялікая пастаноўка «Каляды», у якой удзельнічалі толькі пяць чалавек. Крыху пазней, калі да нас дадалося яшчэ некалькі вучняў, мы пачалі з тэкстаў беларускіх казак рабіць паўнацэнныя пастаноўкі. Першая з іх, «Хітры салдат», мела вялікі поспех. Дзецям гэта работа вельмі спадабалася, некаторыя пастаноўкі яны стваралі самастойна. Наогул, кожны, хто прыходзіць у калектыў, уносіць нешта новае. У нашым тэатры працуюць Святлана Вярбінава, педагог па вакале, і Таццяна Драніцына — тэатральны мадэльер. Гэта неверагодна таленавітыя людзі. Музычныя кампазіцыі сталі неад'емнай часткай любой пастаноўкі, а касцюмы, створаныя Таццянай Драніцынай, прыводзяць гледачоў у захапленне. Наступнай прыступкай у развіцці тэатра стаў удзел у розных конкурсах раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. З кожным годам «Залаты млын» становіцца ўсё больш папулярным сярод вучняў.

Я таксама з'яўляюся ўдзельніцай нашага школьнага тэатра, прыйшла ў яго ў сёмым класе. Пакрысе ўдасканальвала свае танцавальныя навыкі і цяпер з вялікім задавальненнем стаўлю паўнацэнныя харэаграфічныя пастаноўкі, у тым ліку і беларускія народныя танцы. Аляксандр Саковіч, Паліна Гарнізонава, Анастасія Абакунчык, Максім Пронькін удзельнічаюць у пастаноўках нашага тэатра з моманту яго заснавання.

Летась тэатр заняў першае месца на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Ёлка-фэст». Мы вельмі ўдзячныя кіраўнікам «Залатога млына» за тое, што яны даюць нам магчымасць рэалізаваць сябе, унесці свой уклад у развіццё тэатра, у захаванне нацыянальных традыцый.

Кацярына ГРУША,
вучаніца 11 класа Мар'інагорскай гімназіі.

Друкуеццаі ў «Маладосці»

Іераманах Яўстафій жыве ў Жыровіцкай абіцелі і выкладае ў Мінскай духоўнай семінарыі. Пастаянны аўтар часопіса «Маладосць», куратар праекта «З Богам», ён кожны раз прапануе тэксты глыбокія і легкаплынныя адначасова. «Усмешка прадзеда» — частка празаічнага трыпціха пра пошукі сэнсу жыцця.

Айцец ЯЎСТАФІЙ (ХАЛІМАНКОЎ)

УСМЕШКА ПРАДЗЕДА

Урывак

А потым нечакана з'явіўся гэты сшытак. Звычайны вучнёўскі сшытак сярод асабістых рэчаў Іры, якія Сяргей вырашыў упарадкаваць пасля доўгага часу — мулялі вочы... Эх, гэта аказаўся яе дзённік. Сяргей і не ведаў, што жонка-нябожчыца вяла дзённік. Пісала Іра ў асноўным пра сваю адзіноту, пра неразуменне з боку мужа — з гэтага пачынаўся ледзьве не першы запіс, літаральна праз нейкія пару месяцаў пасля таго, як яны ажаніліся!.. Толькі цяпер Сяргей уцяміў, што яго жонка ўсё жыццё пакутавала — праз яго. Пакутавала, бо адчувала: муж не любіў яе... Іра не разумела Сяргея, ды і ён сам сябе не разумеў! Толькі цяпер, чытаючы гэты страшны дзённік, ён усвядоміў, што сапраўды... не кахаў яе. Дакладней, каханне гэтае было не да Іры — да нейкага выдуманага вобраза. Іра гэта адчувала інтуітыўна. З разуменнем таго, што адбываецца ў іх сямейным жыцці, яна, можа быць, і здолела б неяк звыкнуцца, але не разумела, а толькі цярпела і пакутавала. З таго, як памірала Іра, Сяргею стала ясна: яна змірылася і прыняла як непазбежнае крах свайго жыцця, знайшла ў сабе сілы падзякаваць Богу за ўсё і з мірам адышла да Яго. І гэта быў для Сяргея надзвычайны ўрок, які ён адмаўляўся засвойваць. Яму хацелася выць і рваць зубамі гэтае недарэчнае жыццё, замест таго, каб дазволіць узяць сябе за шкірку і адправіць на жывадзёрню. Але сіл на вайну ў Сяргея не было. Дый як можна ваяваяць з пустатой...

Ён ледзьве дацягнуў да навагодніх свят і сабраўся ў дарогу. Усё было ўжо заказана, як звычайна. Сяргей вырашыў усё-ткі ляцець цераз Парыж — вельмі хацелася зноў паглядзець у музеі Дэ-Арсэ любімых імпрэсіяністаў. Колькі разоў ён хадзіў у гэты музей, колькі разоў з адчайнай асалодай удыхаў жыццё, якое ажно сачылася з карцін!..

Асабліва блізкія Сяргею былі карціны Пісаро і Сіслея. У Сіслея ён бачыў два дамінуючыя настроі: настрой яснага і млявага, выціснутага да дна вечара, а потым... нешта вельмі асабістае, няўлоўнае і неверагодна блізкае — можа быць, акурат тое, што ён увесь час спрабаваў злавіць у сваёй душы, сваім жыцці і не мог... Сяргей разумеў, што ў іх, у гэтых карцінах, ажываюць даўно забытыя пачуцці, ажываюць на імгненне — толькі пакуль ён глядзеў на іх. І, як толькі ён адыходзіў, у ім зноў гасла жыццё. І справа не ў кароткай памяці сталага чалавека ці легкадумнасці юнацкіх пачуццяў (калі адчуваеш усё гэта ўпершыню і таму так ярка, так поўна — паспявай толькі лавіць). Не, справа тут, напэўна, у тым, што ўваскрашэнне з мёртвых (мёртвых пачуццяў) — гэта прэрагатыва Бога, а мастацтва можа даць толькі ілюзію вяртання. Мастацтва, разбудзіўшы прагу гэтага ўваскрашэння, закрануўшы нешта вельмі глыбокае (так глыбока, што не магло не параніць), пакідала цябе зноў ні з чым, ператвараючы самае важнае для цябе ў чарговы падман. Падман, вядома, высакародны — і на тым дзякуй.

Разам з тым у карцінах імпрэсіяністаў Сяргей бачыў тое, чаго так пакутліва не ставала яму самому: сумленнасці ў самавыяўленні. І справа нават не ў тым, што ад яго гэтай самай сумленнасці ніхто не патрабаваў, як ніхто і не забараняў яе... Сумленнасць была проста нікому не патрэбная. Але і гэта не так страшна. Сяргей сам баяўся яе — вось што галоўнае! — ён сам баяўся таго, што «распішыся» ён па-сапраўднаму, пачні, скажам, вялікі раман, выяві там усё, што цябе па-сапраўднаму трывожыць, мучыць і... І што? А ці не выйдзе ў выніку які-небудзь паскудны пшык... І такі пшык, што будзе сорамна і яму самому, і яго сябрам, і нават ворагам — ад таго, што яны ворагі такога пшыку?

Сяргей лёгка пісаў тое, што ад яго чакалі, і чым больш пісаў, тым больш папулярнай станавілася яго пісаніна. Так усё жыццё многіх мастакоў праходзіць у прадчуванні, падрыхтоўцы да нечага важнага: «вось наступны раз... вось убачыце яшчэ...» А потым жыццё мінае, і высвятляецца, што галоўным было менавіта гэта — гарачыя калонкі ў інтэрнэт-выданнях або артыкулы пад заказ. Сяргею здавалася, што псеўданім яго ўратуе, дапаможа падмануць самога сябе, але ж не... Ён стварыў новы стыль (дакладней, віртуозна «здзёр» яго з папулярных заходніх выданняў); акружыў сябе сцяной загадкі; выгадаваў двайніка-монстра, які сачыў цяпер з-за гэтай сцяны, каб Сяргей не ўцёк. «У мяне ёсць імя! У мяне ёсць талент! Я яшчэ магу ўсё выправіць!..» — хацелася яму закрычаць, але не атрымлівалася: звычка маўчаць была мацнейшай. У любым выпадку Сяргею было не выйграць... І толькі імпрэсіяністы краналі яго за жывое — ды так моцна, што яму хацелася верыць у гэта жывое, падпарадкавацца іх стыхіі, шукаць у ёй выратаванне.

Але Сяргей занадта добра ведаў жыццё. Ён разумеў: як толькі вернецца дадому, зноў пачне пісаць усялякае глупства — такое паўтаралася ўжо не раз. І нават калі яму за гэтую лухту дадуць Нобелеўскую прэмію, ён не супакоіцца, а, хутчэй за ўсё, яшчэ больш знервуецца. Усё ж такі ў Сяргея яшчэ засталася надзея на тое, што ён які-ніякі, а пісьменнік... Ён фатальна не мог вызваліцца ад звычайнага журналісцкага страху перад «вялікай літаратурай» — менавіта гэтая трывіяльная прычына была пачаткам усіх яго творчых комплексаў.

Сяргей прыляцеў у Парыж у сярэдзіне студзеня. Ён з цяжкасцю знайшоў сабе па «букінгу» больш-менш прыстойны хостэл на Манмартры: аднапакаёўку без асаблівых выгодаў, але затое з балконам, які выступаў проста на бульвар Рашэшуар...

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
19 05 2016 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ВЯСНА. ПЕРАЗАГРУЗКА...

Ну, што, спадарства, дачакаліся нарэшце?! Як у тым анекдоце. «Няцяжка здагадацца, што пасля нудотнага «угу, восень...» надыходзіць не менш тужлівае «о, зноў зіма...», якое пасля змяняе хвалюючае «ура! вясна!» і нарэшце ўпэўненае — «прывітанне, лета!» Тут галоўнае, каб май не забыўся, што ён веснавы месяц і да чэрвеня — рукой падаць. («Па прагнозах Гідраметэацэнтра, гэтым летам тэмпература будзе вышэй, чым зімой».) Бо што ў гэтым годзе надвор'е нас не песціла, дык гэта дакладна. А каму пры такім раскладзе горш, чым іншым? Жанчынам, вядома! «Сёлетні люты папросту наплюваў у душу тым дамам, якія плацяць крэдыт за футра». Далей — не лепш. «В юном месяце апреле в старом парке таял снег...» Гэта ў той час, калі па ўсіх канонах трэба было пераходзіць на кароценькія спаднічкі. Аднак доўгачаканы момант сёлета прайшоў неяк невыразна, непрадказальнае капрызнае надвор'е і тут змазала як эфект прадчування ў мужчын, так і заслужаную «хвіліну славы» ў прыгожай паловы чалавецтва.

«І вось нарэшце прыйшоў май. А лепш бы грошы...» Таму што ў дзяўчат пасля ўсіх гэтых выбрыкаў нябеснай канцылярыі атрымалася неспадзяванка. Ногі белыя незагарэлыя, фігуру калі было рыхтаваць да сезона? («Прабачэння найперш у сваёй таліі прасіце пасля ўсіх гэтых бліноў»). Але справа вырашальная: для фігуры — дыета, для загару і зноў жа супраць калорый — «фітнес» на градках. Так што яшчэ колькі дзён, і нашы дамы будуць у ідэальнай форме. Але каб пражыць гэты час і чахарду са зменай гардэроба, ім патрэбна... Ну, самі здагадваецеся — абновы... Яны ж дзяўчаты. («Маці з дачкой у краме. «Дачушка, табе што-небудзь купіць? — Так! — Што? — Не ведаю, але... два!»). Ваша дама ўжо з маркотным выглядам зазірала ў шафу і, быццам бы ні да каго канкрэтна не звяртаючыся, мармытала нешта накшталт таго, маўляў, «зусім голая»? Гэта нармальна, так і павінна быць! («Жанчына можа бясконца глядзець на тры рэчы. А потым — бац! — і купіць адразу сем»). Так што сэканоміць не атрымаецца, сабе даражэй будзе. («Пчаляр здагадаўся, што жонка знайшла заначку, калі ўбачыў яе з апухлым тварам, але ў новай сукенцы».) Тут справа некалькі ў іншым. Вось што асабіста мяне хвалюе, а месцамі нават палохае, дык гэта звесткі пра тэндэнцыі ў жаночай модзе напярэдадні гэтага сезона. Каб не атрымалася, як у чарговым анекдоце. «Мы планавалі выдатна правесці лета, але яно правяло ўсіх нас».

«Уяўляеце гэтага «свайго ў дошку хлопца» — «дзяўчыну з раёна»? Спартыўны касцюм «адзідас — тры палоскі» пад туфлі на абцасах? Яшчэ хіба кулька з семкамі не хапае».

Напрыклад, спадзяюся, што вось гэтая навамодная тэндэнцыя з прычыны нашага менталітэту абыдзе краіну бокам. На Захадзе знакамітыя і эпатажныя «зоркі»-жанчыны пачалі замяняць вулічнае адзенне... ніжняй бялізнай. Потым да іх далучыліся папулярныя мадэлі і актрысы, а таксама феміністкі, якія палічылі новыя вобразы «сімвалам вызвалення». Цікава, ад чаго? Ніхто там, канешне, у адных трусах і бюстгальтарах па вуліцах не ходзіць, але гэтыя прадметы жаночага гардэроба больш чым красамоўна праглядаюць праз нейкае падабенства адзення. (Як жартавала каманда КВЗ «Вятка», «у ветранае надвор'е шатландская армія выглядае яшчэ больш жахліва».) Псіхолагі мяркуюць, што новая мода ўказвае на ссоўванне межаў прыватнасці ў жанчын. Эксперты разважаюць, гаворыць гэты трэнд пра эмансіпацыю або, наадварот, пераўтварае прадстаўніц прыгожага полу ў секс-аб'екты. («На пляжы стаіць шыкоўная бландзінка і загарае топлес. Да яе падыходзіць мужчына і хуценька цмокае грудзі. «Мужчына, вы зусім з глузду з'ехалі?! — Я вам лайкнуў!»)

Калі ўжо загаварылі пра сподняе... Вы ведаеце, які чарговы маладзёжны трэнд узнік нядаўна? Ніколі не здагадаецеся, бо вам такое нават у галаву не прыйдзе... У сацыяльных сетках набірае абароты новая забаўка дзяўчат, якія самі або пры дапамозе сябровак ці бойфрэндаў стараюцца максімальна нацягнуць уверх уласныя... трусы. Цягнуць з такім імпэтам! Да сярэдзіны спіны, да плячэй, самыя рашучыя і ўпартыя ўмудраюцца дацягнуць і нацягнуць іх — хто стрынгі, хто нешта больш «маштабнае» — на... галаву. («Новы матывацыйны слоган гэтага года: Леа змог, і ў цябе атрымаецца».) А потым фатаграфуюць вынік і выкладваюць у сеціва. Застаецца толькі спадзявацца, што гэта нешта... веснавое, навеянае адсутнасцю цяпла...

Але з надыходам апошняга, думаецца, без сюрпрызаў усё ж не абысціся. Памятаеце, яшчэ нядаўна мы смяяліся з мужчын, які насілі сандалі са шкарпэткамі? Дык вось, па прагнозах, гэта ўжо не маветон, і так сёлета будуць хадзіць... дзяўчаты. Яшчэ моднымі будуць трэнікі і алімпійкі. Апошнія дызайнерамі прадпісваецца насіць пад класічны абутак з сур'ёзным выразам твару, прычым пажадана нават на працу. У дзяўчат вяртаюцца ў моду вастраносыя туфлі. Уяўляеце гэтага «свайго ў дошку хлопца»— «дзяўчыну з раёна»? Спартыўны касцюм «адзідас — тры палоскі» пад туфлі на абцасах? Яшчэ хіба кулька з семкамі не хапае. («Што гэта за пудзіла? — Мая дзяўчына. — Прыгожая».) Кажуць, у модзе будуць джынсавыя курткі не па памеры, акуляры ў палову твару. Калі ўбачыце дзяўчыну, у якой летні сарафан будзе апрануты на тоўсты світар, — таксама лепш не здзіўляйцеся, раяць спецыялісты ад моды. («Бывае, маўчыш, а цябе ўжо няправільна зразумелі».) Проста, хлопцы, памятайце: вясна, перазагрузка...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Поспех — гэта пытанне часу»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)

— Сярод вядомых гітарыстаў некага для сябе лічыце прыкладам?

— Цяпер я не асабліва сачу за станам і развіццём менавіта гітарнай музыкі. Мяне больш цікавяць песенныя фарматы. Але я застаў яшчэ тыя часы, калі ў цане былі «музычныя спартсмены», і тады мне падабаўся Гары Мур, заслухоўваўся Інгві Мальмстынам. Думаю, многія музыканты праходзяць праз перыяды, калі ты цікавішся тэхнічным складнікам выканання. Але ў жыцці на цяперашні момант практыкуючаму гітарысту тое наўрад ці вельмі спатрэбіцца. У нас больш запатрабаваныя студыйныя, сесійныя музыканты. Разам з тым зразумела, што ўсё, у тым ліку і музыка, якую мы слухаем, заўсёды нейкім чынам уплывае на нас.

— Цяжка быць сесійным музыкантам?

— Гэта дае магчымасць працаваць з рознымі калектывамі. Напрыклад, я меў вопыт супрацоўніцтва з такімі беларускімі артыстамі, як Аляксандр Саладуха, Аляксей Хлястоў, гуртом «Тяни-толкай» і іншымі. Для музыканта гэта не толькі цікава, але і карысна. Бо ў кожным музычным стылі, напрамку творчасці таго ці іншага артыста, ёсць свае цікавыя «фішкі». І калі ты прыходзіш у калектыў як сесійны музыкант, то маеш шанс паспрабаваць штосьці для сябе яшчэ не зведанае. Добры вопыт таксама атрымліваеш і ў плане пабудовы стасункаў з людзьмі. Напрыклад, мне даволі доўга давялося працаваць з Аляксандрам Саладухам. Ёсць тое, чым я ў ім захапляюся. Ён умее сярод сотні негатыўных водгукаў знайсці адзін станоўчы і радавацца яму, а ўсё астатняе фільтруе. Такую рысу і я хацеў бы ў сабе выхаваць.

«Пісаць па замове — гэта цяжар для творцы. Я хачу рабіць музыку для душы, а зарабляць можна і іншымі спосабамі».

— Што стымулюе ў працы: жаданне тварыць ці магчымасць зарабіць?

— Для мяне творчасць і грошы не ўзаемазвязаныя. Гурт «Дэвайсы» — мая аддушына, хоць на пачатку нашага існавання была схільнасць да камерцыі. Асабліва, калі пачалі запрашаць на тэлебачанне і здымкі, хацелася гэтым неяк скарыстацца. Але ж з часам разумееш, што такім шляхам ты ставіш сваю творчасць у рамкі. А пісаць па замове — гэта цяжар для творцы. Я хачу рабіць музыку для душы, а зарабляць можна і іншымі спосабамі.

— Пра што вам хочацца гаварыць мовай музыкі сёння, назіраючы за падзеямі ў свеце?

— Рок-гурты першапачаткова існавалі як пратэстныя. Таму мая група ў гэтым сэнсе ўсё ж такі попкалектыў. Нам падабаецца спяваць пра пачуцці, эмоцыі. Добра памятаю, у мяне быў перыяд, калі я саромеўся гаварыць пра асабістае, бо ў такія моманты ты поўнасцю адкрываешся перад публікай. Па-ранейшаму пішу пра тое, што адчуваю, а не пра тое, што модна. Я не належу да тых, хто шукае рэцэпты хітоў.

— А вас часцей успрымаюць як лідара «Дэвайсаў» ці гітарыста «Дразду»?

— Па-рознаму здараецца. Апошнім часам больш як удзельніка гурта «Дразды», бо мы з імі больш «свецімся» на тэлебачанні. Хоць бывае, што прыязджаю ў нейкі горад і чую: «Ён жа да нас з Саладухам прыязджаў!» З Віталікам Карпанавым мне камфортна працаваць. Так склалася, што спачатку я прыйшоў у калектыў часова, а потым застаўся. Тады ў іх быў крызісны ў творчым плане год, і ўжо пасля майго з'яўлення ў групе мы выпусцілі альбом «Шчасце». Там я істотна ўплываў на працэс. Хоць спачатку няёмка сябе адчуваў, калі бачыў, што да мяне прыслухоўваюцца, са мной згаджаюцца. Цяпер мы зноў плануем выпусціць новую пласцінку.

— Гастролі ў вас з чым асацыююцца?

— Гэта рамантыка, але толькі ў тым выпадку, калі едзеш некуды з канцэртамі на некалькі дзён. А не так, што паехаў, пераначаваў і зноў з'ехаў. Ад такіх паездак вельмі стамляешся, бо ты пастаянна знаходзішся ў дарозе, не маеш асабістай прасторы, ды і для адпачынку ўмовы мінімальныя. Калі ж выпраўляешся на пару дзён, то тады нібы трапляеш у іншае жыццё, дзе можаш убачыць новыя месцы, завесці новыя знаёмствы, жыць іншымі турботамі...

— Жонку сабе не сярод прыхільніц знайшлі?

— Не, з ёй мы разам з часоў ву-чобы ў каледжы. Яна не звязана з музыкай, працуе на тэлебачанні. У нас расце сын. Я неяк разважаў пра тое, ці змог бы пабудаваць адносіны з прыхільніцай і зразумеў, што не. У гэтым выпадку чалавек часцей за ўсё ўспрымае цябе такім, якім бачыць на сцэне, а гэта не заўсёды можа адпавядаць таму, які ты «за кулісамі». Я вельмі рады, што побач са мной мой чалавек, які заўсёды падтрымлівае. Дзякуючы ёй я дагэтуль яшчэ не перастаў займацца музыкай. Яна мая муза і мой тыл.

«Калі ты прыходзіш у калектыў як сесійны музыкант, то маеш шанс паспрабаваць штосьці для сябе яшчэ не зведанае. Добры вопыт таксама атрымліваеш і ў плане пабудовы стасункаў з людзьмі».

— Сын любіць слухаць вашы песні ці яму больш цікава з канструктарам гуляць?

— У нас цяпер перыяд трансформераў. А ў плане музыкі Марк — мой індыкатар, ён адкрыта і адразу скажа, падабаецца яму песня альбо не. Я па яго рэакцыі магу аналізаваць, наколькі ўдалай атрымалася работа. І, як паказвае вопыт, калі яму спадабалася кампазіцыя, то і ў слухачоў яна знойдзе шырокі водгук.

— Якія ў вас жыццёвыя мэты?

— Дом яшчэ не пабудаваў, але ў мяне ёсць сям'я, і яна натхняе на многае. Зараз не хочацца распыляцца па дробязях. Ёсць жаданне рабіць усё так, каб сын, калі вырасце, змог мной ганарыцца. А для здзяйснення задуманага, думаю, трэба шчыра верыць у сваю справу, працаваць так, каб перш за ўсё самому за сябе не было сорамна. Калі яшчэ побач з табой і тыя, хто ў цябе верыць, то поспех — гэта толькі пытанне часу.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.023.
Нумар падпісаны ў 19.30 18.05.2016 г.

І ВЕЧНАСЦЬ НАД АЛЖАСАМ

Споўнілася 80 гадоў вялікаму паэту сучаснасці Алжасу Сулейменаву. Казах па складзе свайго характару, чалавек планеты па складзе свайго мыслення, ён уяўляецца роўным у адным шэрагу з такімі мастакамі слова XX стагоддзя, як Барыс Пастэрнак, Яўген Еўтушэнка, Андрэй Вазнясенскі, Бэла Ахмадуліна, Сільва Капуцікян, Мустай Карым, Чынгіз Айтматаў, Давід Кугульцінаў, Кайсын Кулieў, як беларусы Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Іван Мележ, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў... Імёнаў кагорта здаецца бясконцай. Кагорта парушальнікаў спакою і волатаў духу, носьбітаў неардынарнага мыслення, творцаў, здольных знаходзіць словы для выкладання партрэта часу, словы для абрысу галоўных прыярытэтаў светаўладкавання. Адно толькі прачытанне Сулейменавым помніка старажытнарускай літаратуры «Слова пра паход Ігараў» чаго вартае!..



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Алжас Сулейменаў, якому днямі прысвоена званне Героя Казахстана, не так даўно быў госцем Мінска, Саюза пісьменнікаў Беларусі. Творчая інтэлігенцыя сталіцы мела шчаслівую магчымасць слухаць яго прамовы і яго вершы. У беларускага паэта Міколы Мятліцкага як розгалас ад тае сустрэчы нарадзіўся верш «Алжас Сулейменаў у Мінску». Прапануючы яго ўвазе чытачоў «Звязды», хацелася б нагадаць на вартасці перачытання і прачытання самога Алжаса Сулейменава, яго паэзіі, яго магутнай па энергетычнай насычанасці літаратуразнаўчай публіцыстыкі. Хацелася б верыць у яго судакранальнасць з беларускім мастацкім светам.

З юбілеем, Вялікі Паэт! З высокай узнагародай!

Сяргей ШЫЧКО.

Мікола МЯТЛІЦКІ

АЛЖАС СУЛЕЙМЕНАЎ У МІНСКУ

Імкне жыццё... Замнога пераменаў.
Нібы на ўскраі бездані жывеш.
Гаворыць з залай слынны
Сулейменаў —
У кожную душу ўдыхае верш.
За ім — абсягі стэпаў Казахстана,
Прад ім — імкліва спешны час цячэ.
Чытае верш — бы шар зямны,
што ў ранах,
Трымае цёпла на сваёй руцэ.
Святла душы ні блёстачкі не страціў,
Красае зырка іскры дабрыні.
Чытае верш — і ўслед Сяміпалацінск
Рэнтгенаўскія гасіць прамяні.
Цагліны Брэста, дзе пабыў дагэтуль,
Гараць нязмытай чырванню крыві.
Чытае верш — нібы з другой планеты
Гукае ў свет пяшчоты і любві.
І існасць ацалела па-за часам,
І мудрасць вочы роздумна кране.
Чытае верш — і вечнасць над Алжасам
З пытаннем вечным стала: быць ці не?
І гучны голас замірае ў скрусе,
І смуткам захлынаюцца радкі...
Чытае верш — і зычыць Беларусі,
Маёй, радзімай,
Быць ва ўсе вякі.

ПРАВА НА (С)ПАКОЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля смерці маці хлопчык жыў з татам у трохпакаёвай кватэры (мужчына працаваў прадпрымальнікам і добра зарабляў). Але праз пяць гадоў бацькі не стала — утапіўся на лецішчы.

Трохпакаёўка ж была запісана на іншую бабулю Улада — бацькаву маці.

— Тая хутчэй прапісвацца ў кватэру пабегла, — абураецца Алена Трафімаўна. — Сястры маёй кажа: «Мы не справімся з Уладам». Выкінула ўнука, як кацяня, і настойвала, што яго трэба здаваць дзяржаве. Мая сястра не змагла гэтага зрабіць.

За Уладам, які прапісаны ў той кватэры, закон замацаваў пакой. Маёмасных правоў на яго хлопец не мае, можа толькі там пражываць да 23 гадоў. Але ніхто 15-гадовага падлетка па старым адрасе не чакае.

У спадчыну ад маці Уладу і яго старэйшаму зводнаму брату засталася двухпакаёўка. Праўда, яе вымушаны былі прадаць: калі старэйшаму хлопцу споўнілася 18, ён запатрабаваў сваю долю. Жанчыны ўпэўнены, што па-іншаму яны не маглі.

На грошы, якія засталіся ад таго продажу, для Улада купілі пакой у іншай «двушцы». Спадзяваліся здаваць яго, каб пакрысе назбіраць сіраце на цэлую кватэру. Паддаліся на абяцанні рыэлтараў. «Сястры маёй сказалі, што яна за 200 долараў зможа пакой здаваць. Хоць, напэўна, ніколі такіх расцэнак і не было, — разважае Алена Трафімаўна. — А таго суседа (гэта яго жонка пасля разводу прадавала долю ў кватэры), відаць, запэўнілі, што хлопец-інвалід усё роўна не будзе з ім жыць».

Бабуля стараецца забяспечыць унуку годную будучыню.

ПЕРАМОВЫ НЕ ЎДАЛІСЯ

Па законе здаваць у арэнду сваю долю можна толькі са згоды іншага саўладальніка — суседа. Але дамовіцца з ім не атрымалася. Жанчыны падалі ў суд. Іск не задаволілі. Патлумачылі гэта тым, што ў суд не быў прадстаўлены канкрэтны дагавор найму, супраць якога пярэчыць саўладальнік, а значыць, ацаніць, наколькі яго адмова абгрунтаваная, немагчыма.

— Ва ўласнасці Улада пакой на 17 метраў (у саўладальніка — на 11) і дзве траціны падсобных памяшканняў. Да таго ж ён сірата, інвалід. Вось колькі паказчыкаў! Яму ж гарантаваны асаблівы клопат і сацыяльная абарона. Той сусед — урач. Мужчына павінен разумець, што такое хворае дзіця. А ён замахнуўся на плошчу сіраты, — лічыць пенсіянерка. — Суддзя нам сказала іншым разам прывесці на слуханне канкрэтнага кватаранта, прыстойнага. А хто ж пагодзіцца дзеля таго, каб пакой здымаць, па судах хадзіць?

На перамовы, сцвярджаюць жанчыны, саўладальнік не ідзе, кандыдатуры кватарантаў не разглядае. «Пагражаў, што нават калі хто і заселіцца, то ён такія ўмовы там створыць, што чалавек сам не вытрымае і з'едзе», — дадае Галіна Трафімаўна.

Яна згодна здаваць пакой і за 600 тысяч: столькі патрэбна, каб пакрыць выдаткі на камуналку, якую штомесяц плацяць за долю Улада ў той кватэры і на падатак за здачу ўнаём. Галіна Трафімаўна тлумачыць, што лішніх грошай у сям'і няма:

— Унук атрымлівае пенсію 2,5 мільёна. Але на яго лячэнне, ежу, адзенне ідзе вельмі шмат. Толькі за зіму Уладзіку давялося купіць тры пары абутку. З яго паходкай чаравікі хутка зношваюцца.

— 30 тысяч долараў за той пакой аддалі, — уздыхае Алена Трафімаўна. — Сёння прадаць яго можна за тысяч 17. Мы б і прадалі. Але ж не купяць: ніхто не захоча жыць на агульнай кухні.

НЕДАСКАНАЛАСЦЬ ЗАКАНАДАЎСТВА?

Мы патэлефанавалі саўладальніку кватэры. Той, калі пачуў, што звоніць журналіст, на здзіўленне, трубку не кінуў. Мужчына спакойна адказаў, што прапаноўваў пенсіянеркам выйсце — знайсці чалавека з такім жа па метражы пакоем і абмяняцца. З'ехалі б ад яго і жылі спакойна. І пацвердзіў: ніякіх кватарантаў у сябе ён бачыць не хоча.

— Я ўжо чалавек немалады. Хачу жыць так, як прывык. Не чакаць сваёй чаргі, каб схадзіць на кухню ці ў прыбіральню. Тым больш я дзейнічаю паводле закона.

Сапраўды: нормы мужчына не парушае. Ці не ўшчамляе ён такім чынам права іншага саўладальніка карыстацца сваёй доляй? Пытанне спрэчнае. У Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу адзначаюць, што яны не раз абмяркоўвалі пытанні долевай уласнасці на жылыя памяшканні. Адвакат юрыдычнай кансультацыі №2 Маскоўскага раёна сталіцы Крысціна Хома таксама мяркуе, што з заканадаўствам у гэтай галіне ёсць пэўныя праблемы.

— Што да канкрэтнай сітуацыі, я параіла б усё ж такі рыхтаваць дагавор і шукаць кватаранта, які зможа прыйсці ў суд. Разумею, што гэта складана, але, зыходзячы з таго, што прапісана ў законе, іншага варыянта на сёння я не бачу, — гаворыць Крысціна Хома і дадае, што ні тое, што ў хлопца ва ўласнасці большая частка памяшкання, ні той факт, што ён сірата, на справу паўплываць не могуць.

У Беларусі каля трохсот тысяч кватэр знаходзяцца ў долевай уласнасці (маюць некалькіх уладальнікаў). Адвакат заўважае, што часцей спрэчкі ўзнікаюць пры продажы долі, а пытанні здачы ўнаём уласнікі стараюцца вырашаць самастойна і не даводзіць да суда.

У КОЖНАГА СВОЙ ІНТАРЭС

Жанчыны адступаць не збіраюцца. Яны хочуць забяспечыць хлопца асобным жыллём, каб той не апынуўся на вуліцы.

— Няўжо ён не зможа застацца ў вашай кватэры? — пытаюся ў бабулі-апякункі.

— У яе, апроч Уладзіка, яшчэ чатыры спадчыннікі: дачка з зяцем і два ўнукі, — адказвае за сястру Алена Трафімаўна. — Невядома, як у іх складуцца адносіны. У кожнага ж будзе свой інтарэс.

— Чаму б тады не пераехаць пакуль у спрэчны пакой Улада, а гэтую «аднушку» здаваць?

— Ведаеце, я столькі сіл уклала, каб жыллё выглядала так, як цяпер, — Галіна Трафімаўна аглядае свой акуратны пакойчык. — А пасля кватарантаў што будзе?

Пенсіянеркі пастаянна займаюцца з унукам, каб падлетак у будучыні змог жыць самастойна. Праз свой дыягназ высокаму і даволі сімпатычнаму Уладу ў школе часам няпроста: аднакласнікам лёгка пакрыўдзіць хлопца, які не можа даць здачы.

— Дзеці яго абзываюць, але вучым, што з гэтым трэба ўмець спраўляцца. Я цяпер на Ніка Вуйчыча ўзяла самыя танныя квіткі, па 160 тысяч, каб паказаць Уладу, што ўсё магчыма, — кажа Алена Трафімаўна.

Пакуль хлопец вучыцца ў сёмым класе. Праграму паступова засвойвае. Трафімаўны спадзяюцца, што на якую-небудзь працу ён зможа ўладкавацца: прафесіі ўсе патрэбны. Сам Улад празнаецца, што хацеў бы стаць кіроўцам, але тут жа ўздыхае: разумее, што фізічна не зможа працаваць па гэтай спецыяльнасці. «Паспрабую паступіць у каледж, а там паглядзім», — аптымістычна заўважае падлетак. У матэрыяльныя пытанні юнак не ўмешваецца: яму сёння куды важней завесці сяброў. Хочацца спадзявацца, што пасля ўсіх жыццёвых і жыллёвых перапетый Улад не страціць веру ў людзей.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Фота аўтара.

Калі вы сутыкнуліся са складанай жыццёвай сітуацыяй і хочаце падзяліцца набалелым, дасылайце свае гісторыі ў рэдакцыю на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. Будзем шукаць выйсце разам.

■ Экслібрыс «Звязды»

ВАНДРУЕМ ВЯРХОМ НА... КАНАПЕ

Алесь Бадак. Як рассмяшыць папугая: аповесці, казкі, апавяданні, вершы. — Мінск: Звязда, 2015. — 344 с.

Думаю, усе дзеці любяць падарожнічаць. Бо, выпраўляючыся ў вандроўку з мамай ці татам, хай нават проста на шпацыр увечары ці ў краму па прадукты, варта быць гатовымі да самых дзівосных прыгод, новых адкрыццяў і знаёмстваў. Але што рабіць, калі ты яшчэ маленькі, табе нясцерпна хочацца вандраваць, а дарослыя або занятыя, або вельмі стомленыя пасля працы? Натуральна, самастойна выходзіць з дому і ісці далёка табе не дазволяць — раптам нешта здарыцца. Але, калі задумацца, для прыгод не так шмат і трэба — толькі канапа, кніга і багатая фантазія.

Падарожжы на канапе, аўтобусе, машыне, перамяшчэнні ў часе і тэлепартацыі ў дзівосныя краіны прапануе ў сваёй новай кнізе «Як рассмяшыць папугая» вядомы паэт, празаік і дзіцячы пісьменнік Алесь Бадак. Многія творы з гэтага выдання могуць ужо быць вядомыя чытачу. Раней яны выходзілі асобнымі кнігамі, друкаваліся ў перыёдыцы. Таму не памылюся, калі адзначу, што гэты важкі зборнік — а яго аб'ём амаль тры з паловай сотні старонак — можна залічыць да найлепшага, створанага пісьменнікам цягам апошняга часу.

Але не толькі вандроўкамі каштоўная кніга. Як ведаеце, каб падарожнічаць, трэба шмат ведаць, умець і амаль нічога не баяцца. Таму кніга Алеся Бадака — сапраўдная школа для маленькіх чытачоў, будучых падарожнікаў. Але не хвалюйцеся, тут зусім няма строгіх выхавальнікаў, павучанняў, заўваг і страшных пагроз. Зусім наадварот, пісьменнік — вельмі таленавіты і спагадлівы настаўнік. Гуляючы, распавядаючы гісторыі і задаючы пытанні дзецям, аўтар неўпрыкмет пашырае іх кругагляд, вучыць правілам паводзінаў і апавядае пра асноўныя законы жыцця.

Так, пазнаёміўшыся з гісторыяй 10-гадовага хлопчыка Даніка, яго сястры Карыны і іх сябра Грані, маленькія чытачы назаўжды запомняць: варта адгукацца на просьбы аб дапамозе. Не хлусіць і не прыдумляць «уважлівых» прычын накшталт «баліць рука» ці «нямее нага». А раптам тая старэнькая бабулька, якая здаецца нямоглай, — сапраўдная ведзьма? Яна можа зрабіць так, што рука і сапраўды забаліць, а нага — знямее і перастане слухацца. І ніякія ўрачы не змогуць вылечыць такую загадкавую хваробу. А каб зноў стаць здаровымі, дзецям трэба будзе здзейсніць далёкае і небяспечнае «Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў» (менавіта так называецца казачная аповесць з кнігі), прайсці шмат выпрабаванняў і атрымаць дараванне Ведзьмы.

Калі выхаваўчы складнік кнігі «Як прыручыць папугая» амаль незаўважны на першы погляд (бо ўмела схаваны аўтарам), то яе адукацыйны патэнцыял ацаніць вельмі лёгка ўжо пры першым знаёмстве. Зборнік неверагодна багаты на факты і гісторыі. Дзякуючы ўяўным падарожжам маленькія чытачы навучацца правільна паводзіць сябе на вуліцах горада, даведаюцца, навошта працуюць крамы, заводы і фабрыкі. Зразумеюць, чаму не варта баяцца паліклінік і бальніц, і завітаюць на вакзал. Для жыхароў вёскі гэтая вандроўка на канапе можа стаць першай магчымасцю зірнуць на шумныя, мітуслівыя вуліцы горада, а наступнае падарожжа адкрые таямніцы вёскі ўжо для маленькіх гараджан.

Аўтар прапануе зірнуць, як уладкавана жыццё на вясковым падворку. Амаль экзотыка для сучасных гараджан! Тут па двары важна ходзяць гусі, мітусяцца куры; непадалёк, на лузе, пасвяцца коні, козы і каровы, у хляве рохкаюць свінні. Як сапраўдныя гаспадары, двор азіраюць кот і сабака. У агародзе таксама ўсё ідзе сваім ладам — растуць капуста, морква, буракі. Незабыўнымі будуць вандроўкі ў лес, на возера, а таксама экскурсія ў свет насякомых. Не застанецца незаўважаным і шпацыр па чароўным свеце нашых продкаў, дзе побач з чалавекам жывуць незвычайныя міфалагічныя істоты — Русалка і Вадзянік, Дамавік і Лесавік, Ваўкалак і Баба Яга.

Не застануцца пакрыўджанымі і тыя дзеткі, якія любяць чытаць казачныя гісторыі пра жывёл. Добрымі сябрамі маленькім чытачам стануць малпачка Чыта, жабка Кваква, Заяц, які святкаваў дзень нараджэння і марыў навучыцца чытаць, а таксама многія-многія іншыя героі аўтарскіх казак Алеся Бадака. Калі нават нейкі герой ці сюжэт і не прыйдуцца даспадобы дзеткам (што малаверагодна), то сярод вялікай колькасці прапанаваных гісторый усё роўна застаецца магчымасць знайсці нешта цікавае.

Прыемных вандровак!

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 22 июня 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома						
1	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Вяча, ул. Центральная, д. 8А, кадастровый номер 623280402101000084, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1296	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	90 000 000	17 151 700 + публикация в газете	9 000 000
2	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мочаны, ул. Тихая, земельный участок № 1, кадастровый номер 623280406101000421, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1366	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	96 000 000	15 603 980 + публикация в газете	9 600 000
3	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мерковичи, земельный участок № 1, кадастровый номер 623280405101000063, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1430	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	60 000 000	16 193 184 + публикация в газете	6 000 000

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011127 в ЦБУ № 611 филиала № 500 — Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, УНП 600181549, получатель — Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 22 июня 2016 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Заявления на участие принимаются по рабочим дням: 08.00–13.00, 14.00–17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – **16 июня 2016 года до 17.00.** Контактные телефоны: (801774) 58 4 45, 58 4 35, 58 4 36.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Батуринка, дер. Прилепы, дер. Скураты, дер. Лужки, дер. Липники Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	21 июня 2016 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний
3.	**Продавец и его адрес**	Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 – площадь 0,0975 га, № 624883001101000227, дер. Батуринка (по гп № 2) Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624883008301000545, дер. Прилепы (по гп № 1) Лот № 3 – площадь 0,1430 га, № 624883009101000204, дер. Скураты (по гп № 1) Лот № 4 – площадь 0,1500 га, № 624883005601000160 дер. Лужки (по гп № 4) Лот № 5 – площадь 0,1142 га, № 624883005601000240, дер. Липники (по гп № 4)
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	**Начальная (стартовая) цена продажи**	Лот № 1 – 300 000 000 рублей Лот № 2 – 300 000 000 рублей Лот № 3 – 200 000 000 рублей Лот № 4 – 200 000 000 рублей Лот № 5 – 200 000 000 рублей
8	**Условия аукциона**	а) продажа по цене не ниже начальной; б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	дер. Батуринка – подъездные пути дер. Прилепы – подъездные пути дер. Скураты – нет дер. Лужки – нет дер. Липники – газ
10	**Условия оплаты**	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812)
12	**Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками**	Среда в 10.00
13	**Прием документов**	в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
14	**Окончательный срок приема документов**	15 июня 2016 года в 17.00
15	**Контактные телефоны**	8 01776 44 636, 68 030

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1 – 15 293 486 белорусских рублей, лот № 2 – 14 620 458 белорусских рублей, лот № 3 – 15 834 356 белорусских рублей, лот № 4 – 10 158 428 белорусских рублей, лот № 5 – 14 436 244 белорусских рубля и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Капитальное строение, инв. № 412/С-24197 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – заготовительный ларек) площадью 49,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 424050100006000382 (назначение – для обслуживания здания заготовительного ларька) площадью 0,0221 га, расположенном по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А
Начальная цена продажи	156 000 000 (сто пятьдесят шесть миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	15 600 000 (пятнадцать миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей
Продавец	Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 21 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 15 июня 2016 г. до 15.00

Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

Считать недействительной квитанцию формы 1-СУ о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) серии КС №8733183 филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте.

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129

сообщает, что 30 мая 2016 г. в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123, г. Минск, ул. М. Богдановича, 129

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О реорганизации ОАО «Белтрубопроводстрой» в форме выделения из него юридического лица и условиях выделения (наименование, организационно-правовая форма, состав участников, размер уставного фонда и источники его формирования, размер долей участников, юридический адрес выделяемого юридического лица).
2. О порядке выделения юридического лица из ОАО «Белтрубопроводстрой».
3. Об установлении цены выкупа акций акционеров, не участвовавших в общем собрании или голосовавших против принятия решения о реорганизации ОАО «Белтрубопроводстрой» в соответствии с п. 5.9 Устава.

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 17 мая 2016 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 в рабочие дни с 23 мая 2016 г.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Сведения по телефонам: 334-93-19, 334-33-83.

Совет директоров

УНП 100364117

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**Лот №1. Капитальное строение, инв. №240/С\14871, наименование – здание магазина, общей площадью 227,8 кв.м. Первоначальная стоимость – 1 320 500 000 рублей**
Собственник (владелец) имущества	ЗАО «Дубровка», УНН 300352248
Местонахождение (адрес) имущества	г. Орша, ул. Ф. Скорины, 60
Информация об обременениях	Без обременений
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 1 20 июня 2016 года в 11.00
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г. Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел.: 80216543202, 80336161412. Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, 80216543213
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 17.06.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЕ В ОБЪЯВЛЕНИЕ,

опубликованное в газете «Звязда» № 91(28201) от 17 мая 2016 г.,

в том, что по объектам: Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций», Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций», Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями)

будет проведен повторный аукцион 31 мая 2016 г.

Тел. для справок: **375-29-674-55-42, 375-29-640-80-37.**

УНП 200305504

В **суд Несвижского района** поступило заявление о признании ОЛЕЙНИКОВА Владимира Евгеньевича, 1946 года рождения, жителя аг. Снов Несвижского района Минской области, ул. Несвижская, д. 51, безвестно отсутствующим с 2011 года.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду в течение 2 месяцев с момента публикации объявления по адресу: г. Несвиж, ул. Садовая, 11, тел. 801770-2-44-08.

Извещение о проведении 08 июня 2016 г. повторного открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для индивидуального жилищного строительства в Клейниковском сельском Совете Брестского района Брестской области

№ лота	Предмет аукциона	Площадь, га	Начальная стоимость, бел. руб.	Задаток (бел. руб.)	Целевое назначение земельного участка	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.)
1	Земельный участок в аг. Клейники, ул. Новая, 3 121281204601000803	0,1396	36 485 410	3 648 541	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	1. 10 677 400 – за изготовление документации и регистрацию участка; 2. оплата за объявления по актам выполненных работ

По улице Новой в аг. Клейники централизованно проходят сети газоснабжения и электроснабжения.

Аукцион будет проводиться 08.06.2016 в 15.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома № 364100000288 в филиале № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 200177417, код платежа 4002, задатка в размере 10% от начальной стоимости, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона по актам выполненных работ.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – **02 июня 2016 года.**

Контактные телефоны: 93 41 35, 93 41 16.

«НАЙЛЕПШ БЫЛО Б АТРЫМАЦЬ АРЫГІНАЛЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Давайце пагаворым пра дакументальную спадчыну. Ці шмат беларускіх дакументаў знаходзіцца за мяжой?

— Для Беларусі праблема вывучэння дакументальнай спадчыны мае вялікае значэнне, і не толькі з-за набліжэння 500-гадовага юбілею беларускага кнігадрукавання, але і па той прычыне, што доўгі час мы не займаліся ў поўнай меры яе даследаваннем. Кніжная спадчына рухомая, яе лёгка вывезці за межы краіны — такіх прыкладаў вельмі шмат у нашай гісторыі. Можна плакаць, а можна ўспрымаць як факт: большасць кніжных помнікаў знаходзіцца па-за межамі Беларусі. Толькі ў апошнія гады мы ў поўнай меры заняліся вывучэннем таго, што засталося, — як рукапісных, так і друкаваных гістарычных помнікаў. У выніку прыйшлі да даволі сумнай высновы: захавалася ў Беларусі няшмат. Калекцыі, якія збіраліся магнатамі ці шляхтай, у манастырах ці цэрквах, адукацыйных установах, у цэласным выглядзе фактычна няма. Яны цяпер знаходзяцца за мяжой — у Расіі, Польшчы і іншых краінах. Самыя ранніе айчынныя кніжныя помнікі, якія ёсць у нас, датуюцца XV стагоддзем.

«Мы робім спробы вяртання»

— А што наконт спадчыны Скарыны?..

— Мы пачалі працу па падліку асобнікаў, якія ёсць ва ўсім свеце. На сённяшні дзень налічылі больш за 500 кніг Скарыны. У Беларусі з іх — дзесяць, усе яны няпоўныя, захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы як калекцыя. Можна ўявіць прапорцыю: у суседняй Расіі, напрыклад, гэта лічба дасягае некалькіх соцень кніг. Мы робім спробы вяртання, аднак гэта надзвычай складаны працэс. Як правіла, з дзяржаўных бібліятэк і музеяў нічога атрымаць не ўдаецца. Большы плён даюць перамовы з прыватнымі асобамі, а таксама набыццё кніг на міжнародных аўкцыёнах.

«Калі бачаць зацікаўленасць з боку пэўнай краіны да нейкіх дакументаў, то проста павялічваюць цэны на атрыманне лічбавых копій».

— Ці ёсць кніжныя зборы, якія захаваліся ў нас цалкам?

— Ёсць толькі адзінкавыя выпадкі — напрыклад, бібліятэка гродзенскага францысканскага манастыра. Ён знаходзіўся па другі бок Нёмана, па-за цэнтральнай часткай горада. Дзякуючы гэтаму да кляштара была недастатковая ўвага, у XIX—XX стагоддзях яго не рэканструявалі. Там на гарышчы быў знойдзены старажытны манастырскі кнігазбор XVII—XVIII стагоддзяў, вельмі каштоўны і цікавы. Ён не надта шматлікі, аднак важна тое, што захаваўся цалкам. У XIX стагоддзі такіх знаходак было шмат, аднак усё звозілася ў сталіцы — Вільню (цэнтр генерал-губернатарства), Пецярбург і іншыя гарады. А ў гэты манастыр проста не дабраліся. Затое засталіся фрагменты многіх бібліятэк даўняга часу. Ёсць шмат выданняў з другога прыватнага кнігазбору Радзівілаў: першы быў вывезены ў 1772 годзе ў Пецярбург і фактычна стаў асновай бібліятэкі Расійскай акадэміі навук. Далей у XIX і пачатку XX стагоддзя Радзівілы працягнулі працу і ўзнавілі сваю бібліятэку. Яна збіралася ў Нясвіжы да 1939 года, захавалася ў нашай краіне фрагментарна. Частка знаходзіцца ў бібліятэцы Акадэміі навук, частка — у Нацыянальнай бібліятэцы і частка — у Прэзідэнцкай. Гэтыя тры ўстановы валодаюць асноўнымі старажытнымі кнігазборамі. Штосьці ёсць і ў іншых месцах, аднак гэта хутчэй выключэнні. Такія калекцыі налічваюць каля сотні кніг, напрыклад, выданні Полацкай езуіцкай акадэміі, Гродзенскай і Магілёўскай мужчынскіх гімназій (гэта пераважна матэрыялы ўжо XIX стагоддзя).

— Кніжным калекцыям удзялялася дастаткова ўвагі?

— На жаль, за савецкім часам, калі фарміраваліся зборы дзяржаўных бібліятэк, амаль усе калекцыі траплялі ў бібліятэку і «расцярушваліся» па фондах — гэта жахлівая тэндэнцыя, якая шмат дзе ёсць да сёння. Гэта значыць, што калі цэласная калекцыя трапляе ў бібліятэку, яна разбіраецца па кнігах — не захоўваецца комплексам і нават не апісваецца адпаведным чынам. Дакументы трапляюць проста як асобныя кнігі, у тым ліку не пазначаецца, якому ўладальніку яны належалі. Мы і дагэтуль няўважліва ставімся да кнігазбораў. Тое ж было і ў XX стагоддзі: многія манастырскія бібліятэкі разбіраліся разам з ліквідацыяй духоўных семінарый. Ужо сёння па нейкіх другасных адзнаках — надпісах, пячатках — мы спрабуем устанавіць прыналежнасць кніг да пэўных калекцый.

«Выданні ў адкрытым доступе»

— Якім чынам зацікаўленыя даследчыкі могуць дазнацца пра дакументальную спадчыну і атрымаць доступ да яе?

— Ёсць розныя фарматы матэрыялаў. Напрыклад, вынікі даследаванняў публікуюцца ў выглядзе навуковых выданняў або артыкулаў у адпаведных часопісах. Часта мы праводзім бібліяграфічную рэканструкцыю тых або іншых кнігазбораў, вядзём улік кніжных помнікаў, якія знаходзяцца за мяжой, — такую інфармацыю змяшчаем у электронным каталогу Нацыянальнай бібліятэкі. З ім можна працаваць як у самой установе, так і з любога іншага месца свету. Часам робім каталогі разам з замежнымі калегамі, у якіх змяшчаем інфармацыю па ўсіх дакументах па пэўнай тэме. Нядаўна разам з расіянамі зрабілі электроннае выданне па дакументальнай спадчыне Сапегаў, а яшчэ раней — з украінцамі пра кнігазбор Храптовічаў. Калі казаць пра адсканаваныя поўнатэкставыя версіі дакументаў, то яны ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы, і з імі можна азнаёміцца на месцы. Часам некаторыя выданні ўдаецца выставіць у адкрыты доступ. Аднак не ўсе дакументы можна змясціць у сеціве: гэта можа быць звязана з тэхнічнымі момантамі, але часцей — з абмежаваннем, якое накладаюць уладальнікі арыгіналаў.

— Калі хтосьці захоча паехаць за мяжу і там на свае вочы ўбачыць гэтыя дакументы, наколькі адкрыты да іх доступ?

— Усё залежыць ад арганізацыі і ўладальніка. Дакументальная спадчына часта захоўваецца не ў публічных бібліятэках, а ў прыватных калекцыях ці зборах грамадскіх арганізацый. Для нас прынцыпова важна наладзіць кантакт з імі і спрыяць працы нашых даследчыкаў. Натуральна, для працы з кніжнымі помнікамі ў бібліятэцы патрэбен зварот ад арганізацыі, у якой даследчык працуе ці вучыцца, і не факт, што гэты зварот будзе задаволены. У некаторых установах ёсць дадатковыя абмежаванні, звязаныя, напрыклад, з мінімалізацыяй выкарыстання арыгіналаў: калі ёсць электронная копія нейкага каштоўнага дакумента, доступ часта адкрыты толькі да яе. Летась я меў магчымасць працаваць у закрытай бібліятэцы, якая знаходзіцца ў Лондане ў гістарычным раёне Тэмпл, звязаным непасрэдна з ордэнам тампліераў. Там, як ні дзіўна, ёсць некаторыя старажытныя беларускія кніжныя помнікі. Каб атрымаць да іх доступ, трэба было прыкласці шмат намаганняў: гэта ўдалося толькі дзякуючы апекі мясцовых прафесараў, дактароў Лонданскага ўніверсітэта.

— У расійскіх кнігасховішчах многія зборы ляжаць проста запакаванымі, напрыклад, спадчына Сапегаў. Ці ёсць да іх доступ?

— Сапраўды, многія кнігі фактычна знаходзяцца па-за доступам, у значнай меры з-за таго, што яны не апісаны. У абавязкі музейных супрацоўнікаў у прынцыпе не ўваходзіць абслугоўванне тых, хто хоча папрацаваць са старымі кнігамі. Да таго ж у іх звычайна няма адпаведнага каталога для карыстальнікаў. На бібліятэкі нашых калег — расійскіх, украінскіх, польскіх — на вялікі жаль, мы арыентавацца не можам, таму што гэтыя калекцыі, мякка кажучы, не апісаны ў поўным аб'ёме. Напрыклад, бібліятэка Расійскай акадэміі навук і нават Расійская нацыянальная бібліятэка — тыя зборы, дзе захоўваецца асноўная кніжная спадчына Радзівілаў, Сапегаў, многіх іншых беларускіх шляхцічаў, — апісаны толькі фрагментарна. Многае зусім не вывучана — што ў іх змяшчаецца, нам невядома. А калі ты не ведаеш, што ў фондзе, то і заказаць, папрацаваць з пэўнымі помнікамі не можаш. Да таго ж многія дакументы не праходзяць паўнавартасную апрацоўку і ў выніку маюць, у лепшым выпадку, інвентарны нумар, па якім іх можна заказаць. Аднак не змяшчаюць іншых дадатковых пошукавых элементаў, каб можна было знайсці патрэбны помнік і заказаць яго для працы. Інакш кажучы, гэта схаваныя помнікі, якія ў нейкім сэнсе не існуюць, бо ты не можаш іх убачыць і нават не здагадваешся пра іх існаванне.

— Калі ў бібліятэцы Санкт-Пецярбурга такія вялізныя неапісаныя фонды, на якія не хапае ні часу, ні сіл, ці не вяліся з імі перамовы аб вяртанні гэтай спадчыны?

— Там прытрымліваюцца пазіцыі захавання ўсяго, што маюць. Платнае прадастаўленне лічбавых копій і ксеракопій выданняў — фінансавая крыніца для іх далейшага існавання. Таму проста так яны нічога не аддаюць. А калі бачаць зацікаўленасць з боку пэўнай краіны да нейкіх дакументаў, то проста павялічваюць цэны на атрыманне лічбавых копій. Таму спадзявацца на «фізічнае» вяртанне выданняў са збораў іншых краін амаль не даводзіцца. Адзінае, што мы можам рабіць, — праводзіць сістэматычныя перамовы пра магчымасць вяртання. Акты добрай волі часам здараюцца. За савецкім часам было прасцей: рабіліся абмены, падарункі. Такое магчыма і сёння — напрыклад, падарунак да пэўнага свята.

«Кнігі — як нацыянальныя святыні»

— Набліжаецца 500-годдзе Бібліі Скарыны. Ці вядуцца з кім-небудзь перамовы аб магчымасці адпаведнага падарунка?

— Так, мы спрабуем дамовіцца, аднак проста казаць пра жаданне займець у сябе пэўную кнігу не зусім карэктна. Мы распачалі шмат ініцыятыў, у тым ліку спадзяёмся папоўніць свае фонды выданнямі першадрукара. Найлепшым шляхам было б атрыманне арыгіналаў — пра гэта вядуцца перамовы з прыватнымі ўладальнікамі. На шчасце, кнігі Скарыны сёння яшчэ прадаюцца на аўкцыёнах. Натуральна, кошты шалёныя, але мы разумеем гэтыя кнігі як нацыянальныя святыні, таму шукаем сродкі для іх набыцця з самых розных крыніц. З дзяржаўнымі арганізацыямі вельмі далікатна вядзём размовы аб магчымасці атрымання кніг у дар. У некаторых замежных бібліятэках выданні Скарыны прадстаўлены ў чатырохпяці экзэмплярах, таму надзея на такі падарунак слабая, але яна ёсць.

— Пэўна, вядзецца работа і па атрыманні лічбавых копій, стварэнні факсімільных выданняў, часовага экспанавання кніг славутага палачаніна?

— Так, мы спадзяёмся, што ўдасца на пэўны час прывезці з замежных краін арыгінальныя выданні Скарыны і яго наступнікаў — Буднага, Мамоніча, Цяпінскага — а таксама еўрапейскія першадрукі, каб паказаць беларускую спадчыну ў агульнаеўрапейскім кантэксце, падкрэсліць, у якім парадку з'яўляліся выданні, паказаць іх знешні выгляд. Вядзём перамовы і пра атрыманне лічбавых копій, было б вельмі добра да юбілею займець максімальна поўную калекцыю. Робім факсімільнае ўзнаўленне найбольш каштоўных помнікаў — як рукапісных, так і друкаваных. За апошнія гады выйшлі дзясяткі выданняў: старажытныя Евангеллі — Тураўскае, Полацкае, Слуцкае, летапісы (напрыклад Баркалабаўскі) і старадрукі (выданні Скарыны, першы захаваны на нашых землях беларускі буквар, творы асветнікаў, такіх як Сімяон Полацкі, выданні XIX стагоддзя)... Для нас вельмі важна папулярызаваць спадчыну і вяртаць яе ў навуковы і грамадскі ўжытак. Дзеля гэтага арганізуем пэўныя акцыі, пачынаючы з выпуску каляндарыкаў, паштовак і нават марак і завяршаючы вялікімі выдавецкімі праектамі, прымеркаванымі да юбілею. Пачаліся ініцыятывы з пашырэннем і вылучэннем так званай мастацкай скарыніяны. Творы, прысвечаныя першадрукару, актыўна вывучаюцца, аналізуюцца і

Гравіраваны тытульны ліст Бібліі.

ўключаюцца ў пэўны рэестр, а пасля будуць выпушчаны ў выглядзе сувенірнай прадукцыі, альбомаў.

«На гарышчы ў Гродне быў знойдзены старажытны манастырскі кнігазбор XVII—XVIII стагоддзяў, вельмі каштоўны і цікавы».

— 500-годдзе беларускага кнігадрукавання будзе святкавацца і за мяжой?

— Многія калегі-бібліятэкары падтрымалі ідэю правядзення адпаведных мерапрыемстваў у іх краінах. Навуковыя канферэнцыі, прэзентацыі, «круглыя сталы», культурныя акцыі пройдуць у Чэхіі, Вялікабрытаніі, Літве, Расіі, Польшчы, магчыма, у іншых краінах. Мы маем падтрымку нашых дыпламатычных прадстаўніцтваў за мяжой, якія ўжо прымаюць пэўныя захады да святкавання будучага юбілею. Сваю ўвагу праяўляюць і замежныя дыпламаты, што працуюць у Беларусі. Асноўныя мерапрыемствы ў нашай краіне, як мяркуецца, будуць адбывацца ў Мінску і Полацку, і яны таксама будуць мець міжнародны фармат, чакаем шмат гасцей з-за мяжы.

— Алесь Аляксандравіч, усе ведаюць вас як актыўнага папулярызатара спадчыны першадрукара. Аднак ці можна казаць, што святкаванне 500-годдзя Бібліі Скарыны будзе мець агульнацыянальны маштаб?

— Гэтая тэма ўжо сёння актыўна абмяркоўваецца прадстаўнікамі органаў улады: міністэрствамі культуры, інфармацыі, замежных спраў, адукацыі, многімі абласнымі і раённымі выканкамамі — у гэтых структурах прымаюцца актыўныя захады па падрыхтоўцы да святкавання, распрацоўваюцца праграмы святочных мерапрыемстваў. Мы накіравалі прапановы ва ўстановы розных рэгіёнаў — у бібліятэкі, музеі, іншыя арганізацыі культуры, навукі і адукацыі — з запытамі, ці не жадаюць яны далучыцца да святкавання, — каб скаардынаваць іх дзейнасць паміж сабою. У выніку атрымалася праграма больш як на 300 мерапрыемстваў, у якой прымаюць удзел фактычна ўсе рэгіёны краіны. Францыск Скарына — тая асоба, якая ўжо сёння яднае людзей розпага ўзросту, веравызнання, прафесій. Гэта адзіны нацыянальны герой, які прымаецца ўсімі прадстаўнікамі беларускага грамадства без выключэння і ні ў кога не выклікае пярэчання.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

Зберагчы зялёнае багацце

Нядаўна адбыўся IV з'езд грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства лесаводаў». Па выніках мерапрыемства быў прыняты зварот да ўсіх жыхароў краіны, пад якім падпісаліся людзі, якія аддалі збераженню зялёнага скарбу краіны большую частку жыцця, — заслужаныя лесаводы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку Алег Атрошчанка, Аляксандр Буй, Мікалай Дадзько, Алег Дашкевіч, Аляксандр Дамнянкоў, Мікалай Крук, Міхаіл Супрун і Мікалай Русаковіч.

«Мы ганарымся тым, што Беларусь — адна з самых лясных краін. Вялікай павагай карыстаюцца работнікі лесу — тыя, хто прымнажае і ахоўвае зялёнае багацце, рупліва выкарыстоўвае яго. У лясной гаспадарцы працуюць людзі розных спецыяльнасцяў. Гэта леснікі і лясныя рабочыя, лесаўпарадкавальнікі і лесапатолагі, майстры лесу, егеры і шмат хто іншы. І ўсе яны патрэбны лесу, як і лес патрэбен ім. Лесаводы аддана служаць сваёй справе, разумеючы, што ацэньваць іх працу будуць унукі і праўнукі.

У сучасным свеце ўсе разумеюць, што прырода — наш агульны дом. Мы абавязаны жыццём раслінам, асабліва дрэвам — асноўным вытворцам кісларoду. Лес — адзін з найважнейшых элементаў сістэмы жыццезабеспячэння, і калі мы не зможам яго захаваць, то рана ці позна загінем разам з ім.

Таму сёння лесаводы звяртаюцца да ўсіх людзей. Давайце будзем любіць і ахоўваць лес разам! Бо гэта так проста: выконваць правілы пажарнай бяспекі, не смеціць у лесе, не займацца браканьерствам. Маленькай дапамогі не бывае — унёсак кожнага чалавека дапаможа захаваць беларускія лясы і прымножыць іх!» — гаворыцца ў звароце. Грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства лесаводаў» — гэта своеасаблівае братэрства тых, хто любіць лес. У яго склад уваходзяць людзі розных узростаў: вучні школьных лясніцтваў, студэнты ўніверсітэтаў, работнікі лясной гаспадаркі, а таксама ветэраны галіны — усяго больш за 13 тысяч чалавек.

Вераніка КОЛАСАВА.

■ Нефармат

ЗАБАРОНА ЦІ ДАЗВОЛ ДУШЫ?

Ці заўважалі вы, колькі ўсяго ў нашым жыцці забаронена? Пагрозлівыя надпісы папярэджваюць пра недапушчальнасць датыкацца, ступаць, сядаць, пераходзіць, залазіць. У большасці сваёй яны ёсць мера вымушаная, бо суайчыннікі так і пруцца залезці ў трансфарматарную будку, прайсціся па чыгуначных рэйках альбо зазірнуць у чужы двор, калі там гасцей не чакаюць. Па інерцыі забараняюць некаторыя рэчы без асаблівай логікі. Напрыклад, у маленькім аўтобусе, які ходзіць у нас па 23-м маршруце, на пярэднім месцы напісана «Службовае месца. Перавозка пасажыраў забаронена». Кандуктара там ніколі не было, а шыльда была заўсёды...

Любая забарона, згадзіцеся, і прыцягвае. Памятаю, як упершыню мы ездзілі на экскурсію ў Белавежскую пушчу ў класе чацвёртым ці пятым. У фае былога музея прыроды нашу ўвагу, вядома ж, прыцягнула вялікае чучала зубра. На ім быў прымацаваны аркуш паперы з надпісам «Рукамі не чапаць!» І адразу нясцерпна захацелася дакрануцца да аграмаднага, да гэтай пары не бачанага звера, даведацца, ці мяккая яго поўсць. Дачакаўшыся, пакуль адвернуцца экскурсавод і настаўніца, я пагладзіла таго зубра. Гэтак жа зрабілі многія аднакласнікі. Па дарозе дадому мы цішком расказвалі адно аднаму пра сваё тайнае свавольства. І аказалася яно агульным, калектыўным, ад чаго станавілася яшчэ больш радасна і весела. Потым праз дваццаць, а то і трыццаць гадоў ужо ў новым музеі прыроды я не раз назірала, як палахліва аглядваліся малыя экскурсанты, цярэбячы зубрынае чучала.

Відаць, гэта ўжо ў сутнасці чалавечай: «Забароненыя плод салодкі». Апошняе сказаў вядомы літаратурны крытык Леў Анінскі і вывеў, здаецца, яшчэ адзін закон жыцця. Маленькія дзеці стараюцца не толькі памацаць, але і пакаштаваць любую рэч, якую мама браць не дазваляе. Школьнікі не толькі хапаюць рукамі музейныя экспанаты, цяпер яны маюць неабмежаваныя магчымасці далучацца да забароненага ў інтэрнэце. Праўда, жаданне пагуляць па верхатуры, пакурыць, пакаштаваць піва, пакуль бацькі не бачаць, даволі часта носіць не віртуальны, а цалкам рэальны характар. Падрастаюць дзеці, і забавы становяцца больш экстрэмальнымі. У Брэсце маладыя людзі не так даўно каталіся на машыне... зверху. А ў Мінску — ездзілі па праспекце на магазіннай цялежцы. Як пісалі ў сецівe, хлопцы нават правілы дарожнага руху захоўвалі. Калі б не сталі пад канец лупіць па машынах, можна было б успрымаць выхадку як жарт, ну падурэлі троху. Але калі вам весела і энергія выходзіць цераз край, то прычым тут уладальнікі транспартных сродкаў?

Зараз я пра тое, што ў агульначалавечым імкненні далучыцца да нечага забароненага, варта ўсё ж часам адчуваць мяжу. Гэту простую думку чалавецтва выпакутавала сваімі ахвярамі ў пагоні за новай модай на сэлфі. Можна згадаць падлеткаў, якія загінулі альбо пакалечыліся, як тая дзяўчынка, што ўзлезла на вагон пад напружаннем у Пружанскім раёне. А ў Камянецкім раёне загінуў дарослы мужчына, што захацеў сфатаграфавацца з бабром. Звер перакусіў чалавеку артэрыю, выратаваць небараку не ўдалося. Інфармацыя ў лічаныя дні абляцела ўвесь свет, нават амерыканская газета напісала пра трагічнае здарэнне пад Камянцом. Толькі вось аматару сэлфі гэта ўжо не цікава.

Забарона, як і любы закон, не будзе дзейснай, калі яе ніхто не прытрымліваецца. Колькі было спробаў перамагчы п'янства — ніводная не прывяла да пажаданага выніку. І законы прымаліся, накшталт «сухога», і абмежаванні ды забароны выходзілі, і праграмы распрацоўваліся з комплексам мерапрыемстваў. На гэту тэму новыя забароны нараджаюцца ледзь не штодня. Хутка вось апошнія званкі і выпускныя вечары. Бацькі падпісваюць двайныя паперы аб адказнасці за недапушчэнне ўжывання спіртнога дзецьмі, настаўнікі праходзяць інструктажы, дырэктараў школ папярэджваюць у вышэйстаячых інстанцыях, план дзеянняў у раёне кожнай школы атрымліваюць участковыя і іншыя работнікі міліцыі. І кожны год у зводках зноў фігуруюць здрадлівыя паказчыкі. Бо па-сапраўднаму забараніць сабе нешта чалавек можа толькі сам. Ва ўсіх іншых выпадках ён знойдзе пралаз, які абавязкова апраўдае яго душа.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.01	21.12	16.11
Віцебск —	4.43	21.09	16.26
Магілёў —	4.50	21.03	16.13
Гомель —	4.54	20.52	15.58
Гродна —	5.17	21.27	16.10
Брэст —	5.25	21.20	15.55

Месяц

Апошняя квадра 13.05–21.05. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Васіля, Ігната, Максіма, Мікіты, Якава.*
К. *Глорыі, Жанны, Андрэя, Роберта.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



IIHF 2016 ICE HOCKEY WORLD CHAMPIONSHIP RUSSIA Moscow - St. Petersburg

ЗАСТАЦЦА Ў ЖЫВЫХ

НАШЫ ХАКЕІСТЫ ЗАХАВАЛІ ПРАПІСКУ Ў ЭЛІТНЫМ ДЫВІЗІЁНЕ

Нацыянальная зборная завяршыла сваё выступленне на чэмпіянаце свету ў Расіі перамогай над французамі — 3:0.

iihfworlds2016.com

Зборная Беларусі заняла 12-е вынікавае месца, ніжэй за нас хакеісты з Латвіі, Казахстана, Францыі і Венгрыі, але наўрад ці гэты вынік можна назваць здавальняючым. У актыве падапечных Дэйва Льюіса ўсяго дзве перамогі, а ў пасіве сумная статыстыка. Калі гаворка аб выхадзе ў плэй-оф ужо не ішла, паўстала пытанне пра магчымасць вылету нашай каманды з эліты сусветнага хакея, усё вырашылася толькі ў апошнім матчы, дзе беларускія хакеісты сабраліся і атрымалі, нарэшце, пераканаўчую перамогу. Шайбы на рахунку Андрэя Стася (дубль) і Джэфа Плата.

— Так, як павінны былі гуляць на турніры, мы згулялі толькі ў апошнім матчы, — адзначыў пасля гульні **галоўны трэнер зборнай Дэйв ЛЬЮІС.** *— Калі б цяпер у мяне была магчымасць змяніць нешта ў падрыхтоўцы каманды, то нічога б не мяняў. Магчыма, проста мацней бы задумаўся над тым, што мы можам палепшыць. А так стараліся рабіць тое ж самае, што і летась. Адзінае, што змянілася, — у нас на гэтым чэмпіянаце свету была маладая лінія абароны. Кожны матч мы выходзілі на лёд з чатырма абаронцамі не старэйшымі за 21 год, і гэта велізарны плюс*, — сказаў трэнер.

Пасля летняга адпачынку хакеісты зборнай пачнуць міжсезонную падрыхтоўку, потым нашу каманду чакае алімпійская кваліфікацыя, якая пройдзе ў Мінску ў верасні. Пасля невыразнага выступлення Беларусі на чэмпіянаце свету ў многіх узнікла пытанне: ці застанецца на чале зборнай Дэйв Льюіс? На яго адказаў **кіраўнік федэрацыі хакея Ігар РАЧКОЎСКІ:**

— Незалежна ад вынікаў чэмпіянату свету галоўным трэнерам застанецца Льюіс. Мы дэталёва разбяром выступленне каманды на сусветным форуме. Гэта вельмі важна ўлічыць пры падрыхтоўцы да алімпійскай кваліфікацыі, бо ўжо праз паўтара месяца зборная пачне рыхтавацца да гэтага старту. Нам трэба асэнсаваць атрыманыя ўрокі і правесці больш якасную работу. Пасля заключнай гульні турніру з французамі на тварах нашых хакеістаў не было ўсмешак. Ніхто не радаваўся перамозе і таму, што мы здолелі застацца ў эліце. Гэта сведчыць і пра тое, што гульцы паважаюць і сябе, і заўзятараў, разумеюць, што павінны былі зрабіць значна больш.

Адзначым, што па выніках першынства ў Расіі зборныя Венгрыі і Казахстана пакінулі элітны дывізіён, саступіўшы месца камандам Славеніі і Італіі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

УСМІХНЕМСЯ

Тры стадыі перажыванняў уладальніка новага аўтамабіля.

1. Першая драпіна — аж да сэрца.

2. Другая драпіна — да душы.

3. Трэцяя драпіна — да лямпачкі.

— Будзеш булачку?

— Крыху пазней, дзякуй. Мы ж з табой размаўляем. Я не магу есці і гаварыць адначасова.

— Я ведаю. Будзеш булачку?

Усё ж такі не ўмеем мы з мужам рамонт рабіць: усю кватэру адрамантавалі і ні разу не пасварыліся.

— У чым розніца паміж ліфтам у Жэневе і ліфтам у Нью-Ёрку?

— На першым напісана «4 чалавекі ці 300 кг», а на другім — «3 чалавекі ці 400 кг».

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1969. Нумар падпісаны ў 19.30 18 мая 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12